Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!

Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

# БЕЛАРУСЬ САВЕЦКАЯ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТУ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ПАНЯДЗЕЛАК
5 кастрычніка 1931 г.
№ 231 (3320)

НЕ ЗАДЕРЖИВАЙ

# Фарсаваць будаўніцтва!

Забясьпечыць цёплымі памяшканьнямі 1.942.000 галоў буйнай рагатай жывёлы і 2.710.000 галоў сьвіней, якія павінны быць сабраны ў бягучым годзе ў калгасах і саўгасах Савецкай Беларусі—вось тая баявая задача, вырашыць якую мы павінны поўнасьцю і ў карацейшы тэрмін чаго-б гэта не каштавала. Ад таго як справімся мы з гэтай задачай залежыць посьпех правядзеньня чарговай зімоўкі бурнымі тэмпамі растучага стада, якая (зімоўка) вылучаецца адказьнейшым і рашаючым этапам барацьбы за праграму жывёлагадоўлі першай гераічнай пяцігодкі Савецкага Саюзу.

Тэмпы, якімі праходзіць зараз будаўніцтва кароўнікаў і сьвінарнікаў, не гарантуюць перамогі. Сёньняшнія тэмпы будаўніцтва ствараюць рэальную пагрозу, што вялікая колькасьць жывёлы можа застацца зімаваць пад адкрытым небам, альбо, што мы будзем прымушаны аддаць частку жывёлы на ператрыманьне пасобным калгасьнікам ці ў індывідуальны сэктар сельскай гаспадаркі. Ні таго, ні другога мы не павінны дапусьціць. Кожнай карове і цяляці, кожнай сьвіноматцы і парасяці павінна быць забясьпечана месца пад дахам кароўнікаў, пялятнікаў і сьвінарнікаў саўгасаў і калгасаў. Вось чаму будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах зараз зьяўляецца рашаючым участкам барацьбы за праграму жывёлагадоўлі.

Што абазначаюць сёньняшнія ганебныя тэмпы будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах? Апартуністычнае раўнаньне па вузкіх мясцох, няўменьне працаваць па новаму ў новых умовах, няўменьне арганізаваць рабочую сілу і мабілізаваць энтузіязм, працоўны імпэт і гаспадарчую ініцыятыву шырокіх мас саўгасных рабочых і калгасьнікаў.

Самымі «вузкімі месцамі» на будаўніцтве зьяўляюцца—будаўнічыя матар'ялы і рабочая сіла. Не хапае ні таго, ні другога. І вось, многія саўгасы замест таго, каб пачаць арганізаваную вярбоўку будаўнічых рабочых, спакойна аддаліся хвалі самацёку. Прыдзе рабочая сіла—добра, ня прыдзе—што-ж, у наяўнасьці «аб'ектыўныя прычыны». Ня лепш і ў калгасах, ня гледзячы на тое, што ў калгасным сэктары мы маем вялікія лішкі рабочых рук—ледзь не 25 проц., ня гледзячы на тое, што тут справа не ў недахваце рабочых рук. Зараз, калі ў асноўным закончаны асеньнія палявыя работы, зараз тым больш недапушчальна спасыланьне на недахват рабочых рук, зараз спасыланьне на гэтыя абставіны тым больш ня можа зьявіцца апраўданьнем бязьдзейнасьці кіраўнікоў жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў на будаўнічым вучастку.

Трэба сапраўды бальшавіцкімі тэмпамі перабудавацца для работы па новаму і забясьпечыць прыток рабочых на будаўніцтва.

Недахват будаўнічых матар'ялаў таксама не зьяўляецца непераможнай перашкодай. І сапраўды, хіба мы не ўладаем вялічэзнымі магчымасьцямі скарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў? Хіба ў нас мала саломы і глины, каб імі замяніць дахавае жалеза? Хіба на кожным будаўніцтве мала магчымасьцяй для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў будаўнічых матар'ялаў?

Толькі апартуністычным супраціўленьнем скарыстаньню мясцовых будаўнічых матар'ялаў, толькі пежаданьнем ці няўменьнем па-бальшавіцку змагацца за пляны будаўніцтва можна тлумачыць факты згортваньня будаўнічых работ у многіх жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах з-за адсутнасьці будаўнічых матар'ялаў. Маленькі характарны прыклад: у сьвінагадоўчых саўгасах Клімавіцкага раёну на будаўніцтве не хапіла цьвікоў. Што-ж, тут спынілі будаўніцтва? Нічога падобнага. Тут пачалі эканоміць цьвікі—замест таго, каб кожную дошку прыбіваць цьвікамі, пачалі групу дошак спытваць аднэй плянкай. Гэты прыклад паказвае, што пры жаданьні можна шмат чаго зрабіць, пры жаданьні можна перамагчы і такую перашкоду, як недахват будаўнічых матар'ялаў.

Баяцца таго, што ў выніку скарыстаньня мясцовых будаўнічых матар'ялаў і эканоміі матар'ялаў зьнізіцца якасьць будаўніцтва, няма ніякіх пад стаў. Нам важна забясьпечыць нашыя статкі цёплымі памяшканьнямі, няхай ня вельмі раскошнымі, няхай некалькі шаршавымі, але затое цёплымі, чыстымі, сьветлымі, гарантуючымі добрыя выніхі зімоўкі, гарантуючымі нас ад страт.

Вопыт клімавіцкіх сьвінагадоўчых саўгасаў паказвае, якое значэньне мае для посьпеху будаўніцтва мабілізацыя гаспадарчай ініцыятывы і вынаходніцкай думкі саўгасных рабочых і калгасьнікаў. Трэба толькі мабілізаваць гэту ініцыятыву і вынаходніцкую думку, трэба разгарнуць на будаўніцтве шырокае сацыялістычнае спаборніцтва, і тады плян будаўніцтва будзе забясьпечан выкананьнем. А для гэтага неабходна рашучая і бязьлітасная барацьба з кулаком і яго агентурай у радах партыі—правымі і «левымі» апартуністамі, якія спрабуюць сарваць пляны будаўніцтва, або, у крайнім выпадку, пасеюць сумненьні ў рэальнасьці нашых плянаў.

Мы ўступілі ў рашаючыя дэкады на будаўнічым вучастку. Да 15 лістапада мы павінны поўнасьцю закончыць усё будаўніцтва, да 15 лістапада ўсё наша стада павінна быць пастаўлена пад дах.

Дык давайце-ж пачнем па сапраўднаму, па-бальшавіцку штурмаваць будаўніцтва ў жывёлагадоўчых саўгасах і калгасах. Дык давайце-ж па сапраўднаму, па-бальшавіцку забясьпечваць чарговую зімоўку нашай жывёлы.

# Развал капіталістычнай сыстэмы

## Рабочая кляса і ўсе працоўныя капіталістычных краін, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, вядуць рашучую барацьбу за рэвалюцыйны выхад з крызісу

### „Англія ўступае ў неспакойны пэрыяд"

ЛЁНДАН, 1-X. У сувязі з падзеньнем каштоўнасьці ангельскага фунта стэрлінгаў (працовая адзінка) ў Англіі працягваецца нуўхільны рост дарагоўлі. Узьняліся розьнічныя цэны на харчовыя прадукты. Адзначаецца падвышэньне кватэрнай платы. Рост дарагоўлі побач з скарачэньнем заработку выклікае незадаволеньне нават сярод паліцэйскіх, якія таксама рыхтуюцца да арганізацыі дэманстрацый.

Капіталістычны друк адбівае ў сваіх артыкулах і паведамленьнях крайнюю ступень трывогі, якая захапляе кіруючыя групоўкі ангельскай буржуазіі.

Буржуазная газэта «Манчэстэр Гардыян» зазначае, што «Англія ўступае ў неспакойны пэрыяд». Падкрэсьліваючы значэньне посьпехаў кампартыі, газэта піша:

«Калі арганізуецца дэманстрацыя, натоўп расьце, як сьнежная глыба, і адразу вырастае ў дзесяткі тысячную масу. У сучасны момант тысячы людзей зрабіліся больш успрыймальнымі да камуністычных лёзунгаў, чым яны былі за апошнія дванаццаць год».

### Рабочыя забіраюць харч і вопратку

ЛЁНДАН, 3-X. У Глазго 2 кастрычніка адбыліся вулічныя бойкі значна больш сур'ёзнага характару, чым усе сутычкі, якія адбываліся напярэдадні. Паліцыя спрабавала не дапусьціць да паліцэйскага вучастку дэманстрацыі рабочых, якія патрабавалі вызваленьня 13 рабочых, арыштаваных 1 кастрычніка. Паліцыя прыклала ўсе намаганьні, каб не дапусьціць дэманстрацыі, разганяла кіямі групы рабочых. Грузавікі з паліцэйскімі ганяліся з аднэй вуліцы на другую.

Значная колькасьць рабочых здолела дабрацца да паліцэйскага участку „дзе пачалі новыя сутычкі з паліцыяй.

Пасобныя групы рабочых урываюцца ў магазыны, рэквізуюць харчовыя прадукты і вопратку і разьмяркоўваюць іх паміж найбольш галоднымі і горш за ўсё адзетымі рабочымі. Праце тарскія раёны знаходзяцца цалкам у руках рабочых, якія заўладалі вуліцай.

### Нацыянальны ўрад узмацняе тэрор супроць камуністых

ЛЁНДАН, 3-X. Уласьнік друкарні камуністычнай газэты «Дэйлі Уоркэр» Вільгільсон адданы пад суд па абвінавачаньні ў падбухторваньні да мяцежу на падставе закону, які мае ўжо палутарастагоднюю даўнасьць.

Абвінавачаньне, прад'яўленае Вільгільсону грунтуецца на нарукаванай у «Дэйлі Уоркэр» адозьве да маракоў у часе нядаўнай забастоўкі ў Ангельскім Антлянтычным флёце. У абвінаваўчым заключэньні зазначаецца, што лёзунг «ніводнага пені з пэнсіі матросаў» зьяўляецца незаконным.

### „Ніводнага пенса з дапамогі беспрацоўным!"

ЛЁНДАН, 3-X. Макданальд выступіў з прапановай сваёй праграмы ў сваёй выбарчай акрузе Сіхэм на закрытым сходзе мясцовай арганізацыі лэйбарыстаў. Па дарозе ў Сіхэм рабочыя на вадзілі перад цятніком, у якім ехаў Макданальд, сабачы канцэрт, і аўтамабіль, які накіроўваўся на станцыю да месца сходу, суправаджалі сьвісткамі і выгукамі абураньнямі. Ля ўваходу ў будынак рабочымі-камуністамі быў вывешаны плякат з надпісам: «Далоў здрадніка! Ніводнага пэнса з дапамогі беспрацоўным».

Зьяўленьне Макданальда ў залі сходу было спаткана маўчаньнем. У гадзінная прамове Макданальд стараўся давесьці сабраўшымся, што калі-б ён не ўвайшоў у «нацыянальны камітэт», дык беспрацоўныя былі-б асуджаны яшчэ на большыя цяжкасьці. У заключэньне ад імя мясцовай арганізацыі лэйбарыстаў было абвешчана, што «палітыка партыі застаецца ранейшай і яна ў сойме выставіць новага кандыдата ў парлямант».

### Сутычка паміж беспрацоўнымі і паліцыяй у Рочдэйлі

ЛЁНДАН, 2-X. У Рочдэйлі (ў графстве Лянкашыр) адбылася сутычка паміж беспрацоўнымі і паліцыяй, якая спрабавала не дапусьціць дэманстрантаў да сьледваньня па вызначаным імі маршруце. Дэманстранты прарвалі лаг цуг паліцыі і пайшлі па раней вызначаным маршруце. Тым часам былі выкліканы паліцэйскія падмацаваньні, якія аддасьнілі рабочых назад да цэнтральнага пляцу. Тут рабочыя наладзілі масавы мітынг ,на якім была прынята рэзалюцыя аб арганізацыі атрадаў самаабароны супроць паліцэйскіх атак.

### Пад знакам пошукаў згоды...

ЛЁНДАН, 2-X. На працягу ўчарайшага дня ўрад засядаў два разы. Паседжаньні праходзілі пад адзнакай пошукаў згоды ўнутры ўраду. Удзень адбылася тайная нарада караля, пасьля кароль прыняў асобна Балдуіна, Радзінга і Осьціна Чэмбэрлена.

Становішча ўсё яшчэ не акрэсьленае, хоць зрабілася вядомым, што міністры і лібералы згадзіліся ўдзельнічаць у «нацыянальным» урадзе і ў будучым блёку на аснове ўрэзанай праграмы тарыфаў.

Да гэтага часу ня згодзіцца здаваль нючае формы згоды па гэтым пытаньні. Супярэчлівыя весткі паступаюць ад посла пазыцыі Лёйд-Джорджа. Паводле вестак лібеpальнай трэсы і «Дэйлі Гэральд», Лёйд-Джордж рашуча адхіляе супрацоўніцтва на пляц форме тарыфаў і супярэчыць супроць хуткіх выбараў.

### Катастрафічнае гаспадарчае становішча ў фашысцкай Польшчы абвастраецца

ВАРШАВА. 3-X. Дзяржаўны банк агаласіў справаздачу аб гаспадарчым становішчы ў Польшчы ў жніўні г.г. Справаздача канстатуе, што ўраджай збожжа сёлета значна ніжэй леташняга. Па шпаніцы зьніжэньне складае 12 проц., па жыце—26 проц. Ня гледзячы на гэта, цэны на збожжа не падвышаюцца.

У сувязі са зьніжэньнем заработку рабочых і служачых, значна скарацілася гандлёвыя звароты. Становішча нафтавай прамысловасьці пагоршылася ў сувязі з затармаджэньнем экспарту нафтапрадуктаў. Выплаўка чыгуну зьменшылася на 12 проц., выраб сталі —на 8 проц. Агульны разьмер заказаў для мэталюргіі склаў у жніўні усяго 16 з паловай тысяч тон, у той час, як яшчэ ў ліпені ён складаў 34 з паловай тыс. тон.

Гэткае-ж пагоршаньне адбылося ў галіне тэкстыльнай і дрэваапрацоўчай прамысловасьці. Астатнія галіны, як скураная, сілікатная, керамічная, машынабудаўнічая прамысловасьці ўяўляюць малюнак цяжкага крызіснага становішча. Справаздача прыходзіць да вываду, што жнівень зьяўляецца месцам далейшага абвастрэньня крызісу.

### Фінансавая катастрофа нав'сла над ПАЗШ

НЬЮ-ЕРК, 3-X. Пагроза фінансавага крызісу насоўваецца і на Злучаныя Штаты. Друк штодня паведамляе аб 10-15 банкрутствах. Наглядаецца выняцьце ўкладаў з банкаў. Акцыі буйнейшых нью-ёрскіх банкаў на працягу верасьня ўпалі на 35 проц.

На вуліцы банкаў Нью-Ёрку распаўсюдзіліся чуткі аб няўхільным крах ху нават буйнейшых фінансавых прад прыемстваў. Са дню адмаўленьня Англіі ад залатога стандарту, замежныя цэнтральныя банкі выняялі з Нью-Ёрку на 342 мільёны даляраў золата.

Паводле даных за верасень, сталяліцейная прамысловасьць загружана толькі на 28 проц. Цэны на бавоўну, шпаніцу і інш. тавары няўхільна падаюць. За апошнія 24 гадзіны друкам былі агалошаны прамовы генэрала Ботлера, былога камандуючага флётам Сьміта, былога губэрнатара штату Нью-Ёрк, Грына, старшыні амэрыканскай федэрацыі працы, Ламонта, адна го з дырэктароў банкірскага дому Моргана. Усе гэтыя прамовы паперадзілі супроць небясьпекі росту беспрацоўя, якое чакаецца ўзімку.

Статыстычнае бюро «Брэдстрыт Статыстыкал Сэрвіс» агаласіла вынікі анкеты, праведзенай сярод буйнейшых прамыслоўцаў і фінансістаў па пытаньні аб тым, калі чакаецца ажыўленьне дзелавога жыцьця. Паводле апошніх паведамленьняў, Канада ў бліжэйшыя часы таксама адмовіцца ад залатога стандарту. Адначасова з пагыбленьнем крызісу нарастае стачачная хваля.

**ПАДЗЕНЬНЕ КУРСУ ДЗЯРЖАЎНЫХ КАШТОЎНЫХ ПАПЕР ФІНЛЯНДЫІ**

Гельсінгфорс, 3-X. «Соумэн Соцыяльдэмакрат» паведамляе, што паводле апошніх вестак з Нью-Ёрскай біржы, пачалося рэзкае падзеньне курсу фінляндзкіх дзяржаўных каштоўных паперэ. Процантныя аблігацыі катыраваліся да 43 проц. ніжэй номіналу.

### Японскае войска захапляе новыя кітайскія тэрыторыі

ТОКІЕ. 2-X. Ня гледзячы на заявы японскага ўраду аб выводзе японскага войска з занятых ім пунктаў Манчжурыі (крайняя паўночная частка Кітаю), японская ваенщчына працягвае захапляць новыя пункты і раёны.

Звычайнай прычынай для новых захопаў зьяўляюцца распаўсюджваемыя самой-жа ваеншчынай паведамленьні аб «непарадках», нібы та выкліканых «беглымі кітайскімі салдатамі» і нібы та «пагражаючых жыцьцю японскіх грамадзян». Пад гэтай прычынай адпраўлены, напрыклад, новыя атрады японскага войска ў Гірын.

### Савецкая прэса правільна вказала думку аб Лэ Нацый

ТОКІЕ. 2-X. Кітайская газэта «Гоцзі Се-Бао», якая выдаецца ў Харбіне, за яўляе: «Японія, відаць, спрабуе арганізаваць «незалежную Манчжурыю», якая будзе незалежна ад Кітаю, але залежна ад Японіі. Савецкая прэса стаіць на правільных прынцыпах і выказала ў адносінах Лігі Нацый зусім правільную думку.

Мы выказваем савецкаму друку нашу гарачую салідарнасьць. за выказаныя прынцыпы.

### Японскі стаўленік у Манчжурыі „выконвае службовыя абавязкі"

ТОКІЕ. 3-X. Сімбун Рэнго паведамляе з Мукдэну, што вынесена канчатковае рашэньне аб назначэньні на пост старшыні новага мукдэнскага ўраду Юан Цзінь-кая.

Форма кіраўніцтва яшчэ канчаткова ня вызначана, хоць урадавыя органы ўжо сфармаваны і пачынаюць функцыянаваць. Вайсковыя групоўкі настойваюць на стварэньні ў Манчжурыі маніархіі, грамадзянскія чыноўнікі патрабуюць рэспубліку.

***

БЭЙПІН. 3-X. У гутарцы з прадстаўніком газэты «Пэкін-Лідэр» Чжан Сюэлян заявіў, што, паскольку ўвесь друк і дакументы Мукдэнскіх частак знаходзяцца ў руках японскіх інтэрвентаў, яны маюць поўную магчымасьць ствараць лялькавы ўрад у Гірыне і Мукдэне.

Японскія ваенныя часьці захапілі на мукдэнскім аэрадроме 207 аэраплянаў, якія належаць чэха-славацкай фірме Шкода.

ТОКІЕ. 4-X. Як паведамляе агенцтва Сімбун Рэнго, японскае войска разьбіла войска Ван Чуй-чы ля станцыі Бэйшаньчэнцзы (ля Хайлуна).

### „Толькі назначаны Японіяй урад... мае законнае права"

ТОКІЕ. 4-X. Агенцтва Дэмпо Пукім паведамляе з Мукдэну, што японскае камандаваньне агаласіла ўчора афіцыйнае паведамленьне аб тым, што створаны Чжан Сюэ-лянам часовы ўрад ня будзе прызнаны Японіяй. Заява японскага камандаваньня называе Чжан Сюэ-ляна лідэрам «вайсковага ўраду, які заўсёды парушае асобныя правы і інтарэсы Японіі і стварае пагрозу жыцьцю і маемасьці японскіх рэзыдэнтаў». Заява далей гаворыць, што Японія цьвёрда парашыла на мець ніякага дачыненьня з гэтым урадам, што натуральна японская вайсковая ўлада ня прызнала таксама арганізаваны Чжан Сюэ-лянам у Цзінчжоў часовы ўрад.

ШАНХАЙ. 3-X. Паводле паведамленьня Сімбун Рэнго, сход брытанскіх падданых у Ханькоў прыняў рэзалюцыю, якая патрабуе аб брытанскага ўраду неадкладна спыніць перагаворы аб экстэрытарыяльнасьці паміж Англіяй і Кітаем

### Акупанты Манчжурыі замацоўваюцца

ТОКІЕ. 4-X. Водгук паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнго, станавішча ў Манчжурыі заставецца напружаным «галоўным чынам з прычыны забойстваў і рабункаў карэйцаў рэшткамі кітайскіх часьцей». Агенцтва паведамляе, што ўчора ўначы быў «застрэлены японскі вартавы ў Сыцінгаі і што працягваліся напады на карэйцаў і іх забойствы ў мясцовасьцях ля Аньдунь-Мукдэнскай чыгункі і што зроблены напад на японскае консульства ў Хайлуне».

Камандуючы квантунскай арміяй, ня паведамляе Сімбун Рэнго, заявіў, што ён прыме рашучыя захады да выгнаньня кітайскага войска з Манчжурыі.

# Зьдзельшчыну - у брыгады па зяблеву, сяўбе

Асеньняя сяўба і зяб

## Сяўба злачынна зацягваецца, зяб пад ударам зрыву. Па-ранейшаму цягнуцца ў хвасьце сяўбы і зяблева: Уваравіцкі, Койданаўскі, Жыткавіцкі, Тураўскі і Ельскі раёны

### Апошняя пяцідзёнка зруху не дала

#### Падцягнуць адстаючых!

Ня гледзячы на тое, што тэрміны вызначаныя ўрадам прайшлі, асеньняя сяўба па радзе раёнаў БССР недапушчальна зацягваецца. Раённыя арганізацыі раду раёнаў не ўразумелі, што далейшая зацяжка сяўбы—ўдар па ўраджайнасьці азімых.

Недастатковыя тэмпы, якія не забясьпечваюць своячасовае скончэньне сяўбы прымушаюць біць трывогу.

Агульны плян сяўбы на 1-га кастрычніка выканан толькі на 83,7 проц.

Апошняя пяцідзёнка не дала патрэбнага зруху. Калі на 25 верасьня плян па сяўбе быў выканан на 77,9 проц., дык за апошнюю пяцідзёнку плян павысіўся толькі на 6,2 проц.

Рад раёнаў яшчэ і да гэтага часу не пераключыўся на ўдарныя тэмпы перадавых раёнаў, якія па-бальшавіцку закончылі сяўбу.

Так: Церахаўскі раён плян па сяўбе выканаў на 101,9 проц., Бялыніцкі—100 проц., Гарадоцкі — 101,3 проц., Крупскі — 104,3 проц., Аршанскі—100,4 проц., Бешанковіцкі — 102,3 проц., Вушацкі — 101 проц., Гарадокскі—106,7 проц., Лёзьнянскі — 100,6 проц. Расонскі — 100,5 проц.

Да гэтых раёнаў набліжаюцца: Бабруйскі раён, які выканаў свой плян на 99,4 проц., Парыцкі—на 93,5 проц., Рагачэўскі — 96,0 проц., Чачэрскі—99,7 проц., Чырвонапольскі—95,5 проц., Хойніцкі — 93,9 проц., Мсьціслаўскі.—98,3 проц., Чэрвенскі — 98,8 проц., Шклоўскі—99,6 проц., Асьвейскі—95,3 проц., Сіроцінскі—96,2 проц.

Але ёсьць рад раёнаў, якія ганебна цягнуцца ў хвасьце асеньняй сяўбы. Да такіх раёнаў адносяцца:

Пухавіцкі раён, які выканаў плян толькі на 63 проц., Плешчаніцкі—64 проц., Жыткавіцкі—57,6 проц., Ельскі—55,7 проц., Нараўлянскі—56,7 проц., Стара-Дароскі—62,3 проц., Тураўскі—45,3 проц., Уваравічы—32,9 проц., Койданаўскі—59,4 проц.

Яшчэ горшае становішча з выкананьнем пляну зяблевага ворыва. Плян па калгасах і аднаасобным сэктары на 1-га кастрычніка выкананы толькі на 13,9 проц.

У параўнаньні з мінулай пяцідзёнкай выкананьне пляну па зябу павысілася толькі на 3,2 проц. Гэтыя ганебныя паказьнікі гавораць аб напружаным становішчы на зяблевым фронце. Рад раёнаў зусім слаба выконвае плян па зябу. Так Бягомльскі раён агульны плян выканаў толькі на 0,6 проц., Рэчыцкі—1,9 проц., Рагачэўскі—3,4 проц., Нараўлянскі—7,4 проц., Ельскі—5,9 проц., Камарынскі—4 пр., Кармянскі — 5,7 проц., Б.-Кашалёўскі—5,5 проц., Уваравіцкі — 1,6 проц., Асі павіцкі—5,7 проц., Бярэзінскі—1,8 пр., Горацкі—3,5 проц., Касьцюковіцкі—5,6 проц., Крычаўскі — 3,1 проц., Чаўскі — 3,8 проц., Віцебскі—5,3 проц., Сеньненскі—3,3 проц., Чашніцкі—3,8 проц.

Аналёгічнае-ж становішча па зябу і ў астатніх раёнах, дзе плян выканан ня больш як на 10—15 проц. Такое становішча далей нецярпіма.

Трэба мабілізаваць усе сілы на хутчэйшае скончэньне сяўбы і зяблевага ворыва.

А. З—кі.

### За час асеньняй сяўбы арганізаваны новы калгас „Пабеда"

У час асеньняй сяўбы ў вёсцы Крушаў, Коўчыцкага сельсавету, Парыцкага раёну, арганізаваўся калгас «Пабеда». На працягу апошніх двух тыдняў калгас з сваёй мізэрнай гужавой і цягавай сілай пасьпеў засеяць 15 га азімы. Сяўба яшчэ працягваецца.

Уся работа ў калгасе праходзіць па ўдарнаму. Калгасьнікі вядуць работу сярод аднаасобнікаў па ўцягненьні іх ў калгас.

Парыцкаму райкалгасаюзу і мясцовым арганізацыям трэба даць належную дапамогу маладому калгасу «Пабеда».

Ф.

### Раўняйцеся па калгасу імя Варашылава

Калгас імя Варашылава, Крупскага сельсавету, Крупскага раёну, першым у раёне скончыў асеньнюю сяўбу. У выніку правільнай арганізацыі працы, разьбіўкі на брыгады, калгас да 10 верасьня скончыў сяўбу з перавыкананьнем пляну.

Другія калгасы Крупскага раёну цягнуцца ў глыбокім тылле асеньняй сяўбы. Напрыклад, калгасы «Чырвоны Пахар», «Чырвоны Вострай», «Чырвоны Герой» толькі зараз пачалі асеньнюю сяўбу.

Усім адстаючым калгасам Крупскага раёну трэба раўняцца па перадавым калгасе імя Варашылава.

А. Веснавы.

### Першым у раёне калгас „Пралетарская Перамога" скончыў сяўбу

КРУПКІ. Калгас «Пралетарская Перамога», Грыцькаўскага сельсавету, першым у раёне скончыў сяўбу азімага кліну. У тэрмін засеяна 123 га. Выцерабіў увесь лён, вымачыў і адвёз 65 вазоў трасты на Крупскі лёнзавод для апрацоўкі.

Калгас па-бальшавіцку прыступіў да копкі бульбы. На 25 верасьня выкапана 23 га і адгружана пралетарскім цэнтрам гораду звыш 2.000 пудоў бульбы. Усе галіны працы пераведзены на зьдзельшчыну.

Прыклад ударнай работы калгасу «Пралетарская Перамога» пераймуць ва ўсе калгасы Крупшчыны.

Дорв.

### Пераключыцца на ўдарныя тэмпы калгасу „Чырвоная Зорка"

Калгас «Чырвоная Зорка», Шчадрынскага сельсавету, Парыцкага раёну, асеньнюю сяўбу скончыў на 5 дзён раней пляну. Засеяна больш 500 га. Уся праца праводзілася зьдзельна. Да брыгад былі прымацаваны аддзельныя вучасткі працы інвэнтар і сельска-гаспадарчыя машыны. У выніку—нормы выпрацоўкі значна перавыкананы. Замест 1,5 га засявалася адным чалавекам 2,5 га. У час сяўбы былі складзены з калгасьнікаў брыгады «чырвоных сватоў», якія праводзілі працу сярод аднаасобнага сэктару па ўцягненьні ў калгас.

Дзякуючы «чырвоным сватом» за час сяўбы цалкам калектывізавана вёска Кіцін.

Зараз калгас пераключыўся на зяблевае ворыва.

Усе калгасы Парыччыны, раўняйцеся па калгасу «Чырвоная Зорка».

К.

### Аднаасобны сэктар забыты

#### Пляны сяўбы не даведзены да вёсак

Сяўба па аднаасобным сэктары Крупшчыны сельсавету, Крупскага раёну, зрываецца. Сельсавет не даведзеў пляны сяўбы да вёсак і таму аднаасобнікі ня ведаюць колькі каму трэба пасеяць азімны.

РВК добра ведае, што, як кантрактацыя азімны, таксама і сяўба праходзяць зусім слаба, але ніякіх крокаў да ліквідацыі прарываў ня ўжывае.

Аднаасобны сэктар павінен быць пад цягнуты.

Селькор.

### 24,8 проц. выканьня пляну—гэнебны паказьнік для МТС

Паводле зьвестак Трактарацэнтру, плян азімай сяўбы па МТС на 1-га кастрычніка выкананы на 119,2 проц.

Калі па сяўбе МТС мае значныя дасягненьні, дык зусім недатэчнічна адстае ў выкананьні пляну па зябу.

На 1-га кастрычніка МТС выканала свой плян па зябу толькі на 24,8 проц.

Гэтае ганебнае адставаньне ў зяблевым ворыве, МТС павінна ліквідаваць у бліжэйшыя дні. Плян зяблевага ворыва павінен быць выканан своячасова.

П. Барановускі.

### На Аршаншчыне не навучыліся працаваць па-новаму

#### Паказаньні т. Сталіна пакласьці ў аснову ўсяе работы

Паказаньні тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў, у галіне сельскай гаспадаркі, у Аршанскім раёне яшчэ не знайшлі свайго пераламленьня ў штодзённай рабоце кіруючых арганізацый, сельсаветаў і партыйных ячэек. Яны яшчэ не навучыліся працаваць і кіраваць па новаму, ня гледзячы на новыя абставіны ў рабоце.

Адсюль як вынік, у правядзеньні цэлага раду сельска - гаспадарчых кампаній, важнейшых палітычных кампаній на вёсцы, маюцца вялікія прарывы. Напрыклад, асеньняя сяўба па раёне праходзіць надзвычай слаба. Паводле дырэкты. партыі і ўраду, асеньняя сяўба па Аршанскім раёне павінна быць скончана да 25 жніўня, а на справе мы маем зусім адваротнае. Пасьля гэтага тэрміну ўжо прайшоў месяц, але сяўба па раёне яшчэ і на сёньняшні дзень ня скончана. У той час як перадавыя сельсаветы сяўбу ўжо закончылі, значная частка сельсаветаў недапушчальна цягнецца ў хвасьце. Плян сяўбы па раёне выканан толькі на 80 проц.

Яшчэ большыя прарывы мы маем у галіне зяблевага ворыва. Гэта важнейшае мерапрыемства па падвышэньні ўраджайнасьці праводзіцца самацёкам і яшчэ не набыло бальшавіцкіх тэмпаў.

Плян зяблевага ворыва па раёне выканан толькі на 15 проц. Тут прарыў ганебны і ні ў якім разе недапушчальны. Астапенскі, Багушэўскі, Веравейшанскі, Кудаеўскі, Клюкаўскі, Касчучынскі, Копыскі, Машкоўскі, Малатнянскі, Рудкаўскі, Сталінскі, Стайкаўскі і Шапкаўскі сельсаветы толькі зараз распачалі зяблевага ворыва.

Гэтыя прарывы павінны быць ліквідаваны ў самы кароткі тэрмін.

У аснову ўсяе работы павінны быць пакладзены паказаньні т. Сталіна.

А. Кудрын.

### Папярэдзіць зрыў зяблевага ворыва

Зяблевае ворыва па Шчадрынскім сельсавеце вельмі зацягнулася. Ёсьць калгасы, якія нават яшчэ не пачыналі зяблевага ворыва (калгас «Слаўны» і др.).

Ня зябяць і ў аднаасобным сэктары. Гэта тлумачыцца тым, што па сельсавеце не праведзена растлумачальная работа аб значэньні зябу.

Больш перадавыя калгасы («Чырвоная Зорка») заканчваюць зяблевае ворыва.

Трэба ў самы кароткі час разгарнуць работу па зяблевым ворыве з тым, каб ніводзін га не застаўся ня ўзораным.

М. Кручкоў.

Парыцкі раён.

### Там, дзе не арганізавана праца, асеньняя сяўба і зябліва пад пагрозай зрыву

Асеньняя сяўба па Рудзенскім сельсавеце, Пухавіцкага раёну, влачыцца зацягваецца. Плян засеву азімага кліну па калгасах на 27 верасьня выканан толькі на 30 проц. Некаторыя калгасы не разумеюць, што далейшая зацяжка ў сяўбе—удар па ўраджайнасьці азімых.

Галоўнай прычынай, якая зрывае па сьпяховае заканчэньне сяўбы, зьяўляецца слабая арганізацыя працы ў калгасе, недастатковы ўлік працы.

У рэдзе калгасаў зьдзельшчына ў асноўных галінах работы па сяўбе не ўведзена, да брыгад не даведзены нормы выпрацоўкі.

Па некаторых калгасах («Савецкая Беларусь», «Чырвоная Зьмена» і «Новы Шлях») зьдзельшчыны і ўліку працы зусім няма.

Зяблевае ворыва па калгасах сельсавету таксама пад пагрозай зрыву. На 27 верасьня плян зяблевага ворыва выкананы толькі на 7 проц.

Райкалгасаюз і РВК добра ведаючы, што рад сельсаветаў Пухавіцкага раёну не спраўляюцца з сяўбой азімага кліну і зяблевым ворывам, ніякіх крокаў да ліквідацыі адставаньня не зрабілі.

Прарыў відавочны, трэба яго як найхутчэй ліквідаваць.

Верх.

### Поўнасьцю абагульваюць пасевы

#### Для вучоту прыбыткаў—выпучаны спэцыяльныя кашэлі

Магілеў (Наш кар.). Па калгасах Вендарскага сельсавету праведзена прапрацоўка пастаноў НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмяркаваньні прыбыткаў 1931 году. Па ўсіх калгасах праведзены сходы з шырокім удзелам калгасьнікаў, дзе дэталёва абгаворана гэтая пастанова і вынесены пастановы поўнасьцю абагуліць ламмы пасевы і ўбранае збожжа. Абагульненьне праводзіцца па затрачанай працы кожным калгасьнікам. Вылучаны спэцыяльныя камісіі для вучоту.

А. С.

### Аб удзеле ЦП саюзаў, ГРПС і ФЗМК у кампаніі „Дню ўраджаю і калектыв заці"

(З ПАСТ. САКРАТАРЫЯТУ ЦСПСБ).

Сакратарыят ЦСПСБ, абгаварыўшы пытаньне аб правядзеньні з 14-га па 25-га кастрычніка «Дню ўраджаю і калектывізацыі», прапанаваў ЦП саюзаў ГРПС і ФЗМК зараз-жа разгарнуць масавую работу на прадпрыемствах, саўгасах і калгасах вакол правядзеньня «Дню ўраджаю і калектывізацыі». Сакратарыят прапанаваў ЦП саюзаў правесьці сходы рабочых, якія маюць сувязь з сельскай гаспадаркай, паставіўшы задачай 100-проц. уцягненьне іх у калгасы, арганізаваць выезды шэфскіх арганізацый у вёскі і калгасы для правядзеньня данай кампаніі, правесьці выкананьне сацдагавораў, заключаных паміж прадпрыемствамі і калгасамі ў пэрыяд веснавой сяўбы і ўбо рачнай кампаніі. Лепшыя ўдарнікі калгасьнікі і калгасы за выкананьне вытворчых пляноў работ павінны быць прэм'яваны.

ЦСПСБ прапанаваў ЦП саюзаў, МТС і батракоў жывёлагадоўчых і земляробчых саўгасаў, працуючых па вёсках, шырока разгарнуць работу сярод рабочых з тым, каб яны зрабіліся сапраўднымі змагарамі за калектывізацыю.

# 10 кастрычніка пачатак справаздачнай кампаніі саветаў

## Праз масавы агляд выявіць перадавыя і адстаючыя саветы ў перабудове работы па-новаму

### Мабілізаваць шырокія рабочыя, калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на ўзмацненьне саветаў—органаў пралетарскай дыктатуры

## Кулацкія агенты развалілі работу сельсавету

### Вурокі папярнянскай справы патрабуюць узмацненьня апэрацыйнага кіраўніцтва сельсаветамі Меншчыны

Перад намі «Акт абсьледваньня работы Папярнянскага сельсавету» (Менск). Гэты акт, з сямі густа сьпісаных на машынцы аркушоў паперы—гісторыя разлажэньня апарату сельсавету, пад бокам Менскага гарсавету.

Першыя пытаньні, якія паўстаюць пасьля прачытаньня гэтага матар'ялу: дзе быў на працягу амаль цэлага году Менскі гарсавет, чаму ён да гэтага часу не рэагаваў на тыя зьявішчы, якія мелі месца ў адным з падначаленых яму сельсаветаў?

На гэтыя пытаньні мы сёньня адказу не дамо.

Трэба спадзявацца, што кіраўнікі Менгарсавету самі на іх адкажуць, ня гледзячы на тое, што ў сваёй пастанове па справе Папярнянскага сельсавету Прэзыдыум Менгарсавету аб сваёй віне, у сэнсе несвячасовага рэагаваньня на гэтую справу не гаворыць ніводнага слова.

Што-ж мы мелі ў Папярнянскім сельсавеце?

Возьмем для прыкладу ўборачную і асеньня-пасеўную кампаніі бягучага году. Гэтыя важнейшыя гаспадарча-палітычныя кампаніі праходзілі без належнага кіраўніцтва з боку сельсавету. Толькі 15 ліпеня прэзыдыум Папярнянскага сельсавету абгаворваў пытаньне аб уборцы ўраджаю, у той час калі 20 ліпеня трэба было ўжо скончыць уборку. Праўда і раней Папярнянскі сельсавет абгаворваў гэта пытаньне, але як і па ўсіх астатніх гаспадарча-палітычных работах, ён і тут нічога канкрэтнага не зрабіў акрамя вынясеньня агульных, нічога не даючых пастановаў, накшталт «разгарнуць гасспаборніцтва і ўдарніцтва», «разгарнуць работу з беднотой» і г. д.

І вынік такой «работы», такога «кіраўніцтва», не заставіў сабе доўга чакаць: на 11 верасьня мець ці заяўнасьці значны прарыў у выкананьні плянаў уборкі і асеньняй сяўбы. На 11-IX плян сяўбы па сельсавеце выкананы толькі на 37,8 проц., плян сіласаваньня на 18,8 проц., шмат гектараў ураджаю яшчэ ня было ўбрана.

Між іншым трэба адзначыць наступны вельмі характарны факт: пляну сіласаваньня на аднаасобным сэктары ў Папярнянскім сельсавеце зусім ня было.

На тэрыторыі Папярнянскага сельсавету ёсьць 10 калгасаў (345 га, 579 гаспадарак). Зусім зразумела што галоўная ўвага сельсавету павінна была быць накіравана на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Ад нак, кіраўніцтва Папярнянскага сельсавету накіроўвае сваю ўвагу на нешта іншае, а калгасы пакідае ў баку. І вынікам зьяўляецца тое, што калгасы засьмечаны варожым элемэнтам, у калгасах панує абязьлічка, зьдзяшчына ня ўведзена, амаль ва ўсіх калгасах няма правільнай арганізацыі працы, працдысцыпліна на вельмі нізкім узроўні і г. д.

У шмат якіх калгасах («Чырвоны Курсант», «Чырвоны Ўдаронік», імя Н-скай Беларускай дывізіі і інш.) у сярэдзіне верасьня яшчэ не прыступілі да вучоту ўраджаю. Аб апошніх дырэктывах партыі і ўраду, аб разьмеркаваньні ўраджаю, калгасьнікі ня ведаюць.

Такая-ж апартуністычная бязьдзейнасьць была праяўлена кіраўніцтвам Папярнянскага сельсавету і ў адносінах да шмат іншых гаспадарча-палітычных кампаній.

1 верасьня пачынаўся новы навучальны год. Уся наша грамадзкасьць была ўсхвалявана пытаньнямі падрыхтоўкі да яго, а Папярнянскі сельсавет... гэтага пытаньня нават не абгаворваў. Пры такіх умовах зусім натуральным зьявілася тое, што ў сярэдзіне верасьня ня быў яшчэ скончаны рамонт і абсталяваньне школ, школы ня былі ўкамплектаваны, гарачыя сьнеданьні не арганізаваны і г. д.

Аб масавай рабоце сельсавету і гаварыць ня прыходзіцца, бо яе зусім ня было. Пры Папярнянскім сельсавеце былі арганізаваны 8 сэкцый, якія за ўвесь час свайго існаваньня правялі толькі... 8 паседжаньняў. Ніхто работай сэкцый ня цікавіўся і яны працягвалі існаваць фактычна толькі на паперы.

Усё гэта—факты апартуністычнай бязьдзейнасьці, якая прывяла Папярнянскі сельсавет да ганебных прарываў амаль па ўсіх галінах работы.

Акрамя апартуністычнай бязьдзейнасьці ў пастаноўцы Папярнянскага сельсавету мелі месца і іншыя, канкрэтныя правы правага ўхілу, «левых» загібаў, змыканьне з клясавым ворагам-кулаком.

Як, прыкладна, праводзілася ў Папярнянскім сельсавеце самаабкладваньне?

Па існуючых дырэктывах партыі і ўраду ў кожным выпадку прыняцьця самаабкладваньня павінны быць абавязкова паказаны разьмер і мэта яго скарыстаньня. У Папярнянскім-жа сельсавеце у шмат якіх выпадках гэтага не рабілася і ніхто дакладна ня ведаў, на якую суму і на што прымалася самаабкладваньне.

М'ж іншым трэба адзначыць, што адзін з такіх сходаў па прыняцьці самаабкладваньня, дзе былі парушаны дырэктывы партыі і ўраду па гэтым пытаньні, быў праведзены ў паселішчы Якубавічы прадстаўніком Менскага гарсавету тав. Суднікам. Гэты «мудры» «апэрацыйны» работнік гарсавету, які павінен выпраўляць памылкі нізавых зьвеньняў савецкай ўлады, ня толькі не зрабіў гэтага, а, наадварот, значна паглыбіў грубыя палітычныя памылкі Папярнянскага сельсавету.

Мы прывялі гэты факт лічачы, што ён даволі яскрава характарызуе становішча апэрацыйнага кіраўніцтва з боку Менгарсавету сваімі нізавымі зьвеньнямі. (Тав. Суднік за сваю дзейнасьць у Папярнянскім сельсавеце зьняты з работы ,але гэта нікольскі ня зьнімае адказнасьці за дапушчаныя ім памылкі з аргмасавага аддзелу Менгарсавету).

Аб правай дзейнасьці Папярнянскага сельсавету вельмі яскрава сьведчаць і наступныя факты.

Штрафы накладаліся амаль выключна на калгасьнікаў, рабочых саўгасу, беднякоў і серадняковаў аднаасобнікаў. За час з 24 сьнежня 1930 г. да 11 верасьня бягучага году было аштрафавана, па розных прычынах, усяго 283 чал., з якіх 140 калгасьнікаў, 46 рабочых саўгасу, 91 серадняк і... і толькі 5 кулакоў.

Ня толькі ў накладаньні штрафаў, але і ў спагнаньні іх праводзілася кулацкая лінія: калі з аштрафаваных калгасьнікаў, рабочых саўгасу і серадняковаў было спагнана штрафу з 85 чалавек, дык з 5 аштрафаваных кулакоў штраф спагнаны толькі з 3-х.

Такая-ж палітыка патураньня кулаку праводзілася і ў справе спагнаньня цьвёрдых заданьняў па розных відах загатовак. Кулакі Папярнянскага сельсавету здалі замест 28 тон збожжа і 23,5 тон сена толькі... 2 тоны збожжа і 7 тон сена і ніхто нічога не зрабіў для таго, каб прымусіць іх выканаць цьвёрдае заданьне.

А вось факты «левых» загібаў.

Кожнаму зараз вядома, што паводле законаў савецкай улады ні па загатоўках, ні па пазыцы нельга ні ў якім разе даводзіць цьвёрдыя задані ні да бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і тым больш да калгасьнікаў. Кожнаму гэта вядома, а кіраўніком Папярнянскага сельсавету—не. Знаходзячыся ў палоне права-«лявацкіх» настрояў, ідучы на паваду ў кулака, кіраўніцтва Папярнянскага сельсавету даводзіла цьвёрдыя заданьні па загатоўках і па зыцы «3-ці рашаючы» да калгасьнікаў і серадняковаў-аднаасобнікаў.

Крытыка, самакрытыка і друк—магутныя сродкі барацьбы за генэральную лінію партыі, за здаровы савецкі апарат. Гэтага не зразумелі ці не жадалі зразумець ні кіраўнікі Папярнянскага сельсавету, ні кіраўнікі мясцовай партарганізацыі. Крытыка, самакрытыка і друк у Папярнянскім сельсавеце былі ў загоне. Ніхто ня сьмеў крытыкаваць работу старшыні сельсавету тав. Воўка ,ці сакратара парт'ячэйкі тав. Тарасевіча.

Насьценгазэты выпускаюцца толькі ў 2-х калгасах з 10 і адна газэта—шматтыражка ў саўгасе «Вішнёўка».

Нельга сказаць каб кіраўнікі Папярнянскага сельсавету і парт'ячэйкі не рэагавалі на допісы рабселькораў, якія зьмяшчаліся ў шматтыражцы і насьценгазэтах. Але ,як яны рэагуюць?

Калі ў шматтыражцы была зьмешчана заметка крытыкуючая дзейнасьць т. Тарасевіча, ён абвінаваціў рэдактара шматтыражкі тав. Хількевіч ў тым, што яна навяла на яго, як на сакратара парт'ячэйкі, паклёп.

Між тым, гэта заметка пад назвай «Душыцель самакрытыкі» цалкам падцьвердзілася.

Другі яшчэ больш абураючы факт.

У аднэй са школ Папярнянскага сельсавету працаваў настаўнік т. Гусько, Тав. Гусько быў добрым грамадзкім работнікам, актывістам, як заўсёды жорстка крытыкаваў дзейнасьць сельсавету і парт'ячэйкі. Гэта вельмі не спадабалася старшыні сельсавету тав. Воўку і апошні ўзьняў судовую справу супроць тав. Гусько, зьняў яго з работы. Парт'ячэйка не рэагавала на агідна цкаванае актывіста-настаўніка тав. Гусько, чым садзейнічала заціску самакрытыкі.

У заключэньне некалькі слоў аб становішчы партыйнага кіраўніцтва работай Папярнянскага сельсавету. Бюро парт'ячэйкі ня стала на чале правядзеньня гаспадарча-палітычных кампаній і кіраўніцтва работай сельсавету, а наадварот, укосна і непасрэдна садзейнічала стварэньню дапушчаных памылак. Фракцыя сельсавету не працавала, кандыдацкая група за адсутнасьцю кіраўніцтва амаль зусім распалася. Камсамольская арганізацыя амаль цалкам разлажылася. Бадай усе камсамольцы п'янствавалі і ніхто на гэта не рэагаваў.

Зусім правільную ацэнку становішча работы Папярнянскага сельсавету і мясцовай партарганізацыі дала менская ГарКК у сваёй пастанове па гэтай справе.

Менскі гарадзкі савет павінен зрабіць са справы Папярнянскага сельсавету належны вывод аб неабходнасьці рашучага паваротку да работы сельсавету і карэннай перабудовы апэрацыйнага кіраўніцтва імі.

**С. Гр.**

## Слуцкі гарсавет ня рыхтуецца да справаздачнай кампаніі

Надыходзіць справаздачная кампанія гарсаветаў і сельсаветаў. Падрыхтоўка да справаздач павінна праходзіць пад знакам мабілізацыі шырокіх працоўных мас вакол ажыўленьня і перабудовы работы саветаў. Масавы агляд работы павінен стаць прадпасылкай пасьпяховага правядзеньня самой справаздачнай кампаніі.

Але ня гледзячы на тое, што на старонках газэты «Савецкая Беларусь» ужо некалькі дзён даюцца матар'ялы агляду, Слуцкі гарсавет гэтай работы яшчэ не разгарнуў зусім. А між тым, ў рабоце гэтага Гарсавету многа недахопаў. Асабліва гэтыя недахопы выявіліся ў момант правядзеньня апошніх гаспадарча-палітычных кампаній. Перабудова масавай работы ў Слуцкім гарсавеце яшчэ не пачалася, дэпутацкія групы на прадпрыемствах яшчэ не арганізаваны, а сацыялістычнае сумяшчэньне не ўвайшло ў практыку работы гарсавету. Сэкцыі, якія павінны зьяўляцца асноўным зьвяном масавай работы фактычна не працуюць.

Адным з буйнейшых прарываў у Слуцку трэба лічыць камунальную гаспадарку. За апошні будаўнічы сэзон дамы, патрабуючыя неадкладнага рамонту, не адрамантаваны. Масты праз каналы і рэчкі разбураны і ніхто ня прымае мер для прывядзеньня іх у парадак.

Адзіная лазьня ў горадзе яшчэ не адрамантавана ня гледзячы на тое, што рамонт распачаты з раньняй вясны. Увесь горад знаходзіцца ў антысанітарным стане, а пра санмінімум Слуцкія арганізацыі раённага аддзелу аховы здароўя ня думаюць.

Слуцкі гарадзкі савет вельмі мала зрабіў для бесьперабойнага правядзеньня ўсеагульнага навучаньня. У асаблівасьці мала ўвагі аддаецца ліквідацыі няпісьменнасьці. Ёсьць факты падцьвярджаючыя тое, што значная частка няпісьменных не наведваюць ліквпунктаў.

Кіно-тэатр, які пачалі «будаваць» з лета, яшчэ не гатовы.

Сельска-гаспадарчая сэкцыя Слуцкага гарсавету мала зьвяртала ўвагі на стан гаспадаркі ў прыгарадных калгасах і прыгарадных гаспадарках каапэрацыі. У гэтых калгасах яшчэ ня выбрана гародніна, ня выканан плян сіласаваньня і ёсьць пагроза, што бульба ня будзе сабрана своечасова. Гарсавет павінен быў заняцца пытаньнем мабілізацыі ўвагі мас да ўборкі бульбы, аднак гэтага яшчэ ня зроблена.

Неабходна адзначыць, што з боку РВК, Слуцкі гарсавет атрымлівае недастаткова поўнае кіраўніцтва. Характарна, што—сакратар РВК т. Краўкліс на пытаньне аб прычынах слабога кіраўніцтва адказвае так: «а што вам нянькі патрэбны? Вучыцеся працаваць без нас».

Бязумоўна, што такія разважаньні зусім ня могуць умацаваць работу Слуцкага гарсавету, а толькі льлюць ваду на млын апартуністычнай практыкі.

Да надыходзячай справаздачнай кампаніі Райком КП(б)Б і РВК павінны правесьці масавы агляд работы Гарсавету і вынесьці на шырокае абгаварэньне рабочых мас усю работу за апошні пэрыяд. Справаздачная кампанія Слуцкага Гарсавету павінна быць пачаткам рашучай перабудовы ўсёй масавай работы.

**А. К.**

## З пастановы МенгарКК аб выніках абсьледваньня работы Папярнянскага сельсавету

26-IX 1931 г. Прэзыдыум МенгарКК вынес пастанову аб рэзультатах абсьледваньне Папярнянскага сельсавету. У сваёй пастанове МенгарКК адзначае, што Менскаму гарадзкому камітэту партыі і Гарсавету ўдалося дабіцца значных посьпехаў у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і калектывізацыі па сельсаветах Менскага раёну.

Адначасова з гэтым у рэзалюцыі адзначаецца, што ў некаторых сельсаветах партыйныя ячэйкі яшчэ ня сталі на чале калгаснага прыліву і ня здолелі мабілізаваць працоўныя масы на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Асабліва яскрава гэта выявілася ў Папярнянскім сельсавеце.

У рэзультаце праваапартуністычнай практыкі і стаўкі на самацёк у гэтым сельсавеце маецца поўны зрыў асноўных гаспадарча-палітычных кампаній. так, плян сяўбы выканан на 37,8 пр., плян загатовак—на 5,5 проц., сіласаваньне—на 18,8 проц., сельгаспадатак—на 11,3 проц. і г. д. Замест выстарчальнай барацьбы з кулаком сельсавет скаціўся на шлях барацьбы з серадняком, штрафы пераважна спаганяліся з калгасьнікаў і серадняковаў. Далей у сваёй пастанове МенгарКК адзначае, што ў Папярнянскім сельсавеце меліся факты грубага заціску крытыкі і самакрытыкі і прасьледваньня актывіста настаўніка Гусько.

МенгарКК пастанавіла:

1. Бюро Папярнянскай парт'ячэйкі распусьціць, старшыню сельсавету тав. Воўка выключыць з кандыдатаў у члены партыі і справу аб яго рабоце ў сельсавеце перадаць судова-сьледчым органам.

2. Прыняць да ведама, што рахункавод сельсавету Хацановіч за дапушчанае ім злаўжываньне затрыман пад варту.

3. За бюракратычна-фармальныя адносіны да справы Гусько—Гарінспэктуры Асьветы і гарпраўленьню саюзу асьветы паставіць на від. Прыняць да ведама пастанову ЦП саюзу асьветы аб адкраўленьні Гусько ў членах саюзу.

4. Абавязаць сельпартком і ўнуў абранае бюро ячэйкі і сельсавет правесьці шырокую растлумачальную работу сярод партыйных і камсамольскіх арганізацый, калгасьнікаў і працоўнай масы, для мабілізацыі ўвагі на ліквідацыю прарываў у правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній, вядучы рашучую барацьбу з праявамі правага апартунізму і «левых» загібаў у практычнай рабоце.



# Вясковыя парт'ячэйкі—арганізатары мас

## на барацьбу за поўнае выкананьне пляну сяўбы і зяблевага ворыва

### Правых і „левых" апартуністаў, дэзарганізатараў барацьбы за азімы клін і зяблевае ворыва, в'кінуць за борт сацыялістычнага наступленьня

## Парт'ячэйкі ідуць на чале калгаснага руху

### 54 гаспадаркі ўступілі ў калгас

ТАЛАЧЫН. Пасьпяхова праходзіць сяўба ў перадавых калгасах Алёнаўскага сельсавету. Разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж калгасамі, увядзеньне ва ўсіх галінах працы зьдзельшчыны, поўны ўлік працадзён калгасьнікаў—забясьпечылі посьпех у правядзеньні сяўбы. Бальшавік кае скančэньне сяўбы выклікала новы калгасны прыліў.

Бачачы посьпехі ў правядзеньні сяўбы, аднаасобнікі - беднякі і серадняковіскі Хвіліства арганізавалі калгас з 23-х гаспадарак, да якога яшчэ далучылася 21 гаспадарка з вёскі Прысмакі. У калгас «Культура» ўлілося 20 гаспадарак.

Нанова арганізаваныя калгасы актыўна ўзяліся за абагульненьне работае жывёлы, інвэнтара, пасеваў і г. д.

Партячэйкі ідуць на чале гэтага ма гутнага руху.

**Селькор Г. Ванцэвіч.**

## На перадавых пазыцыях

**Шчаўрынскі сельсавет, Парыцкага раёну, зьяўляецца перадавым у раёне па калектывізацыі.**

**Сельсавет набліжаецца да завяршэньня суцэльнай калектывізацыі.**

**Асеньняя пасеўная ў калектывізаваных вёсках ужо закончана.**

**Гэтыя посьпехі дасягнуты дзякуючы правільнай рабоце партыйных і савецкіх арганізацый.**

**Круч коў.**

## Вырваць калгас „Чырвоны фронт" з кулацкага палону

Калгас «Чырвоны Фронт», Жажаўгацкага сельсавету, Магілеўскага раёну, у якім налічваецца каля 20 гаспадарак, на сёньняшні дзень амаль цалкам складаецца з адных кулакоў і заможнікаў.

У гэты калгас залезьлі кулакі: Крэслаў Тарас з бацькам (раскулачаны), Рэвуцкі Трафім (з вёскі Макарынцы—раскулачаны), Бушлякоў Трафім (з в. Мішкоўка), Карпенка Міна (з в. Зарудзееўка), Карпенка Аўхім (з в. Макарынцы),Варанкоў Сямён з сынамі (з в. Мако'я. З заможнікаў у калгас пралезьлі Белачкін Паўла, Лашчыкаў, Лашкоў Арцём, Шугалаў Рыгор, Марозаўхін Барыс ,Лашчакоў Ахрэм.

У кіраўніцтве калгасу да апошняга часу стаялі таксама кулакі—Крэслаў—старшынёю, Бушлякоў—членам праўленьня, і Варанкоў Мікола—сакратаром.

У выніку такога кіраўніцтва, калгас ішоў па шляху развалу. Маёмасьць, якая была калгасам атрымана ад раскулачаных гаспадарак, часткай разбаза рана, а часткай знаходзіцца ў самым безгаспадарчым і злачынным становішчы.

У час уборачнай кампаніі, замест максымальнага выкарыстаньня рабочых рук, кулак Вушлякоў з сваім зяцем Варанковым (пасьпелі ўжо і паранічца) на работу ня ішлі, а будавалі для сябе другі новы дом. Уборка сена сарвана—ня скошана каля 60 гектараў сенажаці, пры чым нават скошанае сена ў адлегласьці аднаго кілёмэтра ад калгасу ўжо два месяцы ляжыць разбітым, ня ўбраным і нашчэнт згніло.

Росту калгас ня мае. Сяляне беднякі і серадняк, бачачы шкодніцтва кулакоў і ўсе непарадкі ў калгасе, заяўляюць, што ў калгас парабкамі да кулакоў яны не пойдуць, тым больш, што беднякоў, якіх маецца некалькі чалавек у калгасе не лічаць нават за людзей, абзываючы іх дурнямі ды іншымі мянюшкамі.

Ня гледзячы на тое, што калгас існуе 2 гады, да гэтага часу ў калгасе ре праводзілася ні рамонту будынку, ні новага будаўніцтва. Абагуленыя будынкі знаходзяцца ў надзвычайна кепскім становішчы.

Асеньняя пасеўкампанія на сёньняшні дзень ня скончана. Аб зяблевым ворыве калгас нават і ня думае. Убраны лён з поля зараз стаіць не аббіты і не разасланы. Усё калгасьнікі заняты справай разьмеркаваньня яблыкаў і груш, а частка з іх увесь час прападае у Магілеве па «калгасных справах».

Калгасная камсамольская ячэйка цалкам знаходзіцца пад уплывам кулакоў. Да апошняга часу сакратаром ячэйкі быў сын кулака Варанкоў Мікола, які часта любіў паехаць на калгасных конях у в. Зарудзееўку за заможнікаў па п'янстваваць. Калі была ўкрадзена ўся збруя з каня, то праўленьне калгасу замест таго каб аднесьці за ліх Варанкова Міколы сьпісала з сваёй маемасьці страту як «естественный убыток».

Ня гледзячы на ўсё гэта, ні сельсавет, ні ячэйка КП(б)Б не прынялі ні якіх захадаў да аздараўленьня калгасу «Чырвоны Фронт». Старшыня сельсавету, які між іншым увесь час сталаваўся у раскулачанага кулака Крэсава, як відаць сам быў пад уплывам гэтай кулацкай кучкі.

Магілеўскі Райком КП(б)Б і Райвыканком павінны зараз-жа прыняць адпаведныя захады да партячэйкі і сельсавету, якія патурающь кулакам. Трэба вызнаць кулакоў, якія ўзялі калгас у свой палон і вядуць яго па шляху поўнага развалу.

**П. Асіпчык.**

## Апартуністы развальваюць работу партячэйкі

Партыйная ячэйка саўгасу імя Лекерта не перабудавала сваёй работы ў адпаведнасьці з новымі задачамі. Парт'ячэйка ў сваёй рабоце мае рад буйных недахопаў, якія прывялі да буйных прарываў у гаспадарчым становішчы саўгасу.

Аб гэтых недахопах ужо ведае шырокая савецкая грамадзкасьць. І на вялікі жаль, ні Менскі гарком КП(б)Б, ні сама парт'ячэйка да гэтага часу ня прынялі ніякіх мер для зьнішчэньня ўсіх недахопаў, якія тармозяць гаспадарчы рост саўгасу.

Парт'ячэйка як не стаяла, так і не стаіць зараз на чале сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва зусім слаба разгорнуты. Крытыка і самакрытыка не разгорнуты. Замест разгортваньня самакрытыкі—яе заціскаюць. Усё гэта дрэнна адбіваецца на працоўнай дысцыпліне, якая і без таго знаходзіцца ў дрэнным становішчы. Панує абязьлічка ў карыстаньні с-г. інвэнтаром, няма адказнасьці за даручаную работу.

Парт'ячэйка зусім не вядзе барацьбы з бесгаспадарчасьцю і расхляпанасьцю, якая ёсьць ня толькі ў рабоце адміністрацыйнага пэрсаналу, але і сярод значнай часткі рабочых. Сярод рабочых назіраецца п'янства, супроць якога не вядзецца ніякай барацьбы.

Насьценгазэта своячасова сыгналізавала аб усіх гэтых недахопах, але на гэта ніхто не зьвярнуў увагі.

Усе гэтыя факты кажуць аб тым, што партыйная ячэйка не павярнулася тварам да вытворчасьці, тварам да асваеньня тэхнікі с.-г. вытворчасьці. Парт'ячэйка не паставіла ў цэнтры сваёй увагі барацьбу за колькасныя і якасныя паказьнікі ў выкананьні прамфінпляну саўгасу.

Такія важнейшыя палітычныя кампаніі, як сіласаваньне, будаўніцтва і зяблевае ворыва,—прайшлі мімо парт'ячэйкі. У выніку гэтага, плян сіласаваньня знаходзіцца пад пагрозай поўнага зрыву, будаўніцтва рухаецца марудрымі тэмпамі, зяблевае ворыва правальваецца, прарывы ў гаспадарчай рабоце ўсё больш і больш павялічваюцца.

Культурна-масавай работы сярод рабочых няма. Рабочы калектыў не мабілізаваны на баявое правядзеньне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

**П. Лекертавец.**

## У чым сакрэт перамогі?

**Глуск.** (Белта). Выкананьне пляну асеньняй сяўбы і зяблевага ворыва ў Глускім раёне пад пагрозай зрыву. На 20-га верасьня плян асеньняй сяўбы па калгасах раёну выкананы толькі на 58,9 проц., па зяблевым ворыве на 20 проц. Па індывідуальным сэктары па сяўбе плян выкананы на 40 проц., а па зяблевым ворыве плян выкананы толькі на 18 проц.

Ганебна зрываецца сяўба па аднаасобным сэктары ў Загальскім сельсавеце, дзе плян выкананы толькі на 9 проц., Клетнянскім с-с.—на 11 проц., Германа-Слабодзкім—19 проц., Лясковіцкім—19,6 проц.

Калгасы, якія арганізавалі асеньнюю сяўбу на аснове зьдзельшчыны, сацспаборніцтва і ўдарніцтва ня толькі выканалі, але і перавыканалі свае заданьні. Калгас «Юны барацьбіт», Хвастовіцкага сельсавету, плян сяўбы выканаў на 172,4 проц. Калгас «1-га мая» выканаў плян сяўбы на 166 проц. На 20-га верасьня калгасамі ўзарана пад жыта 133 проц. пляну. Брыгады па ворыве свае заданьне замест вызначаных 10,5 дзён, выканалі за 7 дзён. Асабліва прыклады паказваюць брыгады моладзі. Калгас «Чырвоны гігант», Гацкага сельсавету, сяўбу скончыў і пераключыўся на зяблевае ворыва і ўборку бульбы.

Посьпех у правядзеньні сяўбы атрыманы толькі таму, што на чале барацьбы за азімы клін сталі парт'ячэйкі, якія ў выніку свайго апэрацыйнага кіраўніцтва, забясьпечылі перамогу і на гэтым найдказьнейшым вучастку сацыялістычнага будаўніцтва.



# Выгнаць абязьлічку з кароўніка, сьвінарніка

### Дагляд за жывёлай—слабое месца ў рабоце большасьці жывёлагадоўч х гаспадарак. Райкалгассаюзы ня сталі яшчэ на чале будаўніцтва буйных фабрык малака і мяса

### На працягу 2-хмесячніка ліквідаваць прарывы па арганізацыі малочных і сьвінагадоўчых таварных фэрм

## Бабруйскі райкалгассаюз яшчэ не павярнуўся тварам да жывёлагадоўчых фэрм

Пастанова ЦК і СНК зьяўляецца разгорнутаю праграмаю разьвіцьця сацыялістычнае жывёлагадоўлі. Практычная прапрацоўка яе ва ўмовах Бабруйскага раёну павінна выліцца ў правядзеньне раду практычных мерапрыемстваў па павялічэньні колькасьці таварных жывёлагадоўчых фэрм, павялічэньні пагалоўя іх, паляпшэньні догляду жывёлы, актыўнай барацьбе за большы выхад таварнай прадукцыі.

З прапрацоўкай адозвы райкалгассаюз запаздала спазьніўся, пры чым з агульнай колькасьці 32 калгасных таварных фэрм адозва прапрацоўвалася толькі ў 10. У астатніх неспэцыялізаваных калгасах адозва зусім не прапрацоўвалася. Вакол адозвы ня была мабілізавана грамадзкая думка калгасьнікаў, у выніку чаго ў большай колькасьці калгасаў гэтая прапрацоўка выллася прыняцьцем агульных рэзалюцый. Ніякіх канкрэтных мерапрыемстваў у сувязі з прапрацоўкаю адозвы ня было прынята, а адсюль, зразумела, што і вынікі такой папяровай прапрацоўкі вельмі нязначныя.

**Чарапашыя тэмпы камплектаваньня**

Раённая нарада, якая адбылася 29 жніўня, прыняла канкрэтны плян пашырэньня жывёлагадоўлі ў раёне. Паводле гэтага пляну, колькасьць малочна-таварных фэрм была вызначана да 33 супроць 23 па ранейшаму пляну, колькасьць сьвінагадоўчых таварных фэрм павялічана супроць ранейшага пляну на 100 проц. Вызначана была арганізацыя 13 цялятных фэрм і г. д. Але рэалізацыя гэтых плянаў на сёньняшні дзень разгортваецца вельмі марудна з прычыны апартуністычных адносін да гэтай справы Райкалгассаюзу.

Камплектаваньне МТФ, якое павінна быць скончана і кастрычніка, выканана ўсяго толькі на 60 процантаў, на сьвінагадоўчых фэрмах плян камплектаваньня выкананы на 20—25 проц.

Вакол арганізацыі таварных фэрм не праведзена дастатковай растлумачальнай работы, значная частка гэтых фэрм яшчэ не аформлена дагаворамі.

Ніводнае з мерапрыемстваў, вызначаных плянам і прынятых нарадаю па пытаньні камплектаваньня таварных фэрм (закупка ў загатоўчых арганізацый, закупка ў калгасьнікаў, пераход ка з калгасаў) не праведзена ў жыцьцё. Калгассаюз да гэтага часу абсалютна нічога не зрабіў у гэтым напрамку. Нічога ня зроблена і ў справе мабілізацыі калгасных мас неспэцыялізаванага таварнага жывёлагадоўчага тыпу на арганізацыю гадоўлі сьвіней для здачы дзяржаве.

**Усё на тым-жа месцы**

Паўнейшую бязьдзейнасьць у камплектаваньні сьвінагадоўчых фэрм, якую праявіў Бабруйскі Райкалгассаюз, характарызуюць наступныя факты: На 1 мая ў сьвінагадоўчых фэрмах знаходзілася 243 сьвінаматкі, на сёньняшні дзень склад статку не павялічыўся. Ёсьць такія фэрмы (арганізаваныя даўно), якія зусім не ўкамплектаваны. Так, фэрма «Чырвоны Лётнік» на сёньняшні дзень мае толькі 10 сьвінаматак у той час, як па пляну ў ёй павінна быць 60. Такое самае становішча і ў сьвінагадоўчых калгасных фэрмах «Новае жыцьцё», «Колгас», у МТФ «Новы шлях», «Глуша», імя Молатава. Райкалгассаюз зусім не скарыстаў тых магчымасьцяй і тых мэтадаў працы, якія раіць адозва ЦК і СНК для павялічэньня пагалоўя жывёлы ў таварных фэрмах.

Толькі ў апошні час райкалгассаюз паслаў на вёску людзей, але вынікаў гэтай працы няма.

**Будаўніцтва не разгарнулі, кармавая база ня створана**

Паводле пляну, у таварных фэрмах раёну павінна быць пабудована 11 кароўнікаў, 13 сьвінарнікаў, 3 стайні і 2 сілосныя вежы. На сёньняшні дзень па будована толькі 5 сьвінарнікаў. Кароўнікі толькі пачаты ці зусім ня будуюцца. Прыстасаваньне памяшканьняў пад сьвінарнікі і кароўнікі ідзе марудным тэмпам.

Надзвычайна дрэнна абстаіць справа з забесьпячэньнем таварных фэрм кармамі. Па раёне не хапае значнае колькасьці грубых і канцэнтраваных кармоў. Між тым сілосная кампанія прайшла нездавальняюча. Па малочна-таварных фэрмах плян сіласаваньня выкананы ўсяго толькі на 35 проц. Агульны плян сіласаваньня па раёне выкананы на 30 процантаў.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што з прычыны апартуністычных адносін раённых арганізацый да практычнай рэалізацыі адозвы партыі і ўраду зрываюцца пляны па разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Двухмесячнік сацыялістычнай жывёлагадоўлі павінен забясьпечыць рашучы пералом у правядзеньні ўсіх мерапрыемстваў.

На правядзеньне гэтай работы павінны быць мабілізаваны шырокія масы калгасьнікаў.

**Брыгада газэт: «Савецкая Беларусь», «Акцябр» і «Камуніст»: Дамброўскі, Рубенчык, Матдін.**

## Жлобіншчына ўключылася ў 2-хмесячнік жывёлагадо лі

**ЖЛОБІН.** (Ад нашага спэцкора). У Жлобінскім раёне пачаўся ўдарны 2-хмесячнік жывёлагадоўлі.

Створана раённая камісія. Мабілізаваны раённыя работнікі і спэцыялісты, якія накіраваны ў сельсаветы для ліквідацы, прарываў на фронце жывёлагадоўлі.

Мабілізаваны 15 студэнтаў Чырвона Бярэзкага тэхнікуму для абслугоўваньня бліжэйшых МТФ і СТФ.

**А. Жук.**

## Палепшыць дагляд за жывёлай

У калгасе «Белкаапсаюз», Гарэліцкага сельсавету, Пухавіцкага раёну, ёсьць 45 кароў і значны статак сьвіней. Каровы як дойныя, так і ялаўкі кормяцца аднолькава і стаяць у адным хляве. Дагляд за сьвінямі дрэнны, ім не падсьцілаюць сьвежай саломы.

Праўленьне калгасу павінна зьвярнуць увагу на палепшаньне догляду за каровамі і сьвінямі.

**К. Пуціцкі.**

## Бярэце прыклад з калгасу імя К. Маркса

МТФ калгасу імя Карла Маркса, Слуцкага раёну, выканала плян камплектаваньня па жывёле на 135 проц.; плян здачы таварнай прадукцыі выканан на 130 проц.

Калгас своячасова скончыў пабудову кароўніка на 125 галоў. Абязьлічка па дагляздзе за жывёлай цалкам ліквідавана. Работа праведзена на зьдзелышчыну. Усё гэта дасягнута дзякуючы шырокай масавай работы вакол выкананьня дырэктыў партыі аб разьвіцьці жывёлагадоўлі.

## МТФ імя Дзяржынскага выканала плян камплектаваньня

**БУДА-КАШАЛЁВА.** (Белта). МТФ імя Дзяржынскага плян камплектаваньня выканала на ўсе 100 проц. Пастаўлена 237 кароў.

Здача таварнай прадукцыі выканана на 95,6 проц. Здана 350 цэнтн. малака.

Поўнасьцю ліквідавана абязьлічка. Каровы прымацаваны да поўных асоб.

## Камплектаваньне МТФ і СТФ на Вушаччыне не закончана,

### абязьлічка не ліквідавана, будаўніцтва не разгорнута, кармовая база ня створана

У большасьці калгасаў Вушаччыны адозва ЦК і СНК аб разьвіцьці сацыялістычнай жывёлагадоўлі не распрацавана. Партыйныя і камсамольскія арганізацыі і сельсавет не мабілізавалі шырокія колы калгасьнікаў, беднякоў і серадняковаў-аднаасобнікаў на ажыцьцяўленьне мерапрыемстваў, вызначаных партыяй і ўрадам у галіне жывёлагадоўлі.

У выніку гэтага пляны па жывёлагадоўлі зрываюцца: камплектаваньне МТФ і СТФ ня выкананы, будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў не закончана, стварэньне кармавой базы знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

У раёне, паводле пляну, павінна быць арганізавана 15 МТФ са стадам у 1500 галоў. На сёньняшні дзень арганізавана толькі 12 фэрм, у якіх пастаўлена 810 кароў, што складае 54 проц. заданьня па колькасьці кароў.

Яшчэ горш абстаіць справа з камплектаваньнем СТФ. Замест 700 сьвіна матак, пастаўлена толькі 252, ці 36 проц. пляну.

Будаўніцтва сьвінарнікаў і кароўнікаў зрываецца. Па

# Абязьлічка - тормаз у грузапатоку асеньня-зімовых перавозак

## Зламаць абязьлічку, укараніць гаспадарчы разьлік, узьняць тэмпы падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак

## Рэшткі абязьлічкі па-бальшавіцку ліквідаваць

Партыя дала баявую дырэктыву лік ідаваць абязьлічку і перайсьці на спа ваную. Гэта мерапрыемства зьяўляец а рашаючым у справе аздараўленьня транспарту і выкананьні пляну перавоз ак. Але гэту галоўнейшую і важней шую задачу партыйныя, прафэсыяналь ныя і гаспадарчыя арганізацыі чыгун ы Віцебскага вузла не паднялі на ад аведную вышыню.

Спараная язда не замацавана і па ёньняшні дзень. За 2-ю палову жніўя я процант зрыву спаранай складаў: а пасажырскіх цягнікох — 14,6 проц., а таварных — 20 проц., на рабочых 8,7 проц. і па манэўровых—4,9 проц. Па становішчы на на 20-га верасьня а дэпо ст. Віцебск спаранай яздой хоплена: машыністых—98,2 проц., па очнікаў — 92,2 проц., і качагараў— 4,3 проц.

Што-ж садзейнічае зрыву спаранай? Першая і галоўная прычыны тая, што а гэтага часу паравозныя брыгады ыя маюць цьвёрдага календарнага ра рыка руху цягнікоў. Практыкуецца мэ ад выклікаў, для гэтага ўтрымліваец а спэцыяльны штат выклікальнікаў. Пры такой пастаноўцы працы паравоз ыя брыгады ня маюць магчымасьці длучацца з дому, бо яны могуць ыць выкліканы на цягнік у любы час. ылі выпадкі, калі брыгады чакалі вы ліку па 10 дзён і іх пасылалі на цяг ік толькі тады, калі яны давалі аб абе вестку, але шмат работнікаў не акае выклікальнікоў і робяць адлуч і. З гэтай прычыны за другую пало у жніўня не зьявіліся на паравозы— 0 памочнікаў машыністаў і 81 кача ар.

Значная доля віны ў зрыве спара ай і сваячасовай адпраўкі цягнікоў адае на нарадчыкаў. Так, 7-га ве асьня была выклікана брыгада на цяг ік № 48, якога зусім ня было і бры ада была адпраўлена дамоў. Такія вы адкі мелі месца 31-га жніўня, 2-га і -га верасьня. 3-га верасьня брыгада уворава была выклікана на паравоз № 5236 на 12 гадзін 35 хвілін у той ас, калі гэты паравоз пайшоў а 8-й адзіне раніцы.

У выкліках пануе сыстэматычная дытаніна. Так, 8-га верасьня нарад ык Швэд на паравоз № 4351 выклі аў непрымацаваную брыгаду. Нарад ых Сямёнаў запісаў няўку качагару Ціханоўскаму 17 жніўня ў той час, алі ён быў у паездцы. Гэты-ж самы ямёнаў 15-га верасьня на паравоз Ц-439 ня выклікаў прымацаванага ка агара Дахіма. 18 верасьня на пара оз Щ-2093 ня выклікаў прымацава ага качагара Кучынскага і на пара оз Щ-389 памочніка машыніста Ар сова.

Нарадчык Рыбак 12-га верасьня на аравоз Щ-452 ня выклікаў памочніка ашыніста Парнхенскага. 14-га верась я на паравоз 3-4357 ня быў выклікан качагар Тачыла. 18-га верасьня на паравоз Щ-443 ня быў выклікан памочнік машыністага Чарноў. 20-га верась ня па віне нарадчыка мелі месца два выпадкі зрыву спаранай.

Нарадчык Голубеў 11-га верасьня на паравоз—С-196 ня выклікаў прымацаванага качагара Макарава. Падобныя факты займаюць значнае месца ў працы чыгункі і садзейнічаюць зрыву спаранай.

За апошні час процант адміністрацыйных спагнаньняў значна павялічыўся. За паўтара месяцы 13 проц. усіх працуючых на вузьле рабочых атрымалі адміністрацыйнае спагнаньне. Сярод парушыцеляў ёсьць і члены партыі (машыніст Белякоў 21-га верасьня зьявіўся п'яным).

Сярод асноўнага кадра чыгуначнікаў-машыністаў працдысцыпліна не на належнай вышыні. Памочнік машыніста Голубеў не зьяўляўся па выкліку 2 разы. Машыніст Ніколаеў адмовіўся ехаць у Новасакольнікі. Машыніст Селядзец 21-га верасьня зьявіўся на цягнік п'яным.

Па віне качагараў Міхальчанка, Гаўрылава, Дарафеева, Раманава і Ляхноўскага былі затрыманы цягнікі. Усе гэтыя факты, гавораць аб тым, што працдысцыпліна сярод паравозных брыгад знаходзіцца на нізкім узроўні.

Вакол парушэньняў працдысцыпліны і зрыву спаранай не ствараецца шырокая грамадзкая думка, не даецца рашучы адпор канкрэтным парушыцелям. Таварыскія суды не скарыстоўваюць сваіх правоў. Насьценныя газэты стаяць у баку ад барацьбы супроць тых, якія зрываюць мерапрыемствы па аздараўленьні транспарту. Партыйныя ячэйкі не вядуць уліку членаў партыі, па віне якіх зрываецца спаранае, не накладаюць мер партыйнага ўзьдзейнічаньня. Прафэсыянальныя арганізацыі не мабілізуюць увагу ўдарнікаў і грамадзкасьць вакол канкрэтных парушыцеляў.

Адбыўшаяся канфэрэнцыя ўдарнікаў і нарада трыкутніка чыгункі не дала належнага зруху ў справе перабудовы форм і мэтадаў працы.

Неабходна зараз-жа па баявому перабудаваць масавую работу і работу нізавых партыйных, прафэсыянальных ячэек такім чынам, каб яны зьявіліся сапраўднымі барацьбітамі за здаровы паравоз за спаранае.

Замяніць існуючую сыстэму выклікаў правільна выпрацаваным, цьвёрдым графікам руху цягнікоў. Праверыць склад нарадчыкаў, ліквідаваць сярод іх абязьлічку. Устанавіць шчыльную сувязь паміж дыспэтчарскім апаратам і начальнікам цягі.

Сярод складу качагараў правесьці адпаведную масавую працу па ўзьняцьці працдысцыпліны.

**В. П.**

Месячнік дарожнага будаўніцтва

## Узьняць рацыяналізатарскую работу на дарожным будаўніцтве

У сакавіку месяцы г. г. Галоўдартранс аддаў загад «арганізаваць пры нарабах бюро рацыяналізацыі па 3—5 чалавек», якія фактычна арганізаваны ў чэрвені месяцы і да гэтага часу работнікамі не ўкамплектаваны, бо нарабы не зразумелі значэньня рацыяналізацыі.

Да ліпеня месяца работай бюро рацыяналізацыі нарабаў, якія падпарадкаваны непасрэдна Белдарбуду, кіраваў сэктар рацыяналізацыі Галоўдартрансу, а ў ліпені месяцы Белдарбуд аддаў загад аб арганізацыі бюро рацыяналізацыі, на якое ўскладаецца кіраўніцтва бюро рацыяналізацыі нарабаў. Гэты загад застаўся на паперы.

Толькі ў верасьні месяцы адноўленае кіраўніцтва Галоўдартрансу і Белдарбуду зацікавіліся справай рацыяналізацыі, накіравалі кіраўніка сэктару рацыяналізацыі ў Ленаблдартранс для азнаямленьня з пастаноўкай рацыяналізатарскай работы ў іх, запрасілі ад іх інжынэра рацыяналізатара для кансультацыі і дапамогі, склікалі нараду рацыяналізатараў, на якой пры дапамозе інжынэра-рацыяналізатара Ленаблдартрансу, прыняты мерапрыемствы па ўзмацненьні рацыяналізатарскай работы. Але ажыцьцяўленьне гэтых мерапрыемстваў Белдарбудам затрымліваецца.

Ня гледзячы на недапушчальна дрэнныя адносіны дарожных работнікаў да справы рацыяналізацыі, ўсё-ж у некаторых раёнах маюцца значныя дасягненьні. Напрыклад, па нарабу 1, праведзена рацыяналізацыя работы каткоў, што дало 100.882 руб. эканоміі. Зроблена і ўжыта конная шчотка для ачысткі шашы, што дало 1.464 руб. эканоміі.

Па нарабу 2 распрацавана пытаньне арганізацыі скразных вытворчых брыгад з разьдзяленьнем у іх працы па спэцыяльнасьці, што дае 60.000 руб. эканоміі, праведзена прапанова бюро рацыяналізацыі аб замене фэльдэгераў плацельшыкамі, гэта дало 54.000 руб. эканоміі.

Распрацавана пытаньне аб замене ручнога капаньня карыта пад шашу і брук грэдэрамі, што дае 40.000 руб. эканоміі. Рацыяналізацыя камнядрабільных установак дае 1.400 руб. эканоміі. Ужываньне двайных хістальных грохатаў дае па нарабу 1.200 руб.

Па нарабу 3 рацыяналізатарскія мерапрыемствы далі 62 тыс. руб. эканоміі.

Пералічаныя рацыяналізатарскія мерапрыемствы разам даюць 429.346 руб. эканоміі. Але гэта яшчэ ня ўсё. Тут ня ўключана эканомія па Віцебскім нарабе і нарматыўна - рацыяналізатарскіх станцыях.

Але досыць і гэтых прыкладаў, каб паказаць дарожным работнікам, што рацыяналізацыя дае вялікую карысьць. Пералічаныя рацыяналізатарскія мерапрыемствы даюць ня толькі эканамічны эфэкт, але яны палепшаюць якасьць і падвышаюць прадукцыйнасьць працы, што падвышае тэмпы дарожнага будаўніцтва. Напрыклад, да рацыяналізацыі брукаўшчык рабіў 16,5 кв. м., а пасьля рацыяналізацыі ён робіць звыш 30 кв. м., каток укотваў да рацыяналізацыі 16 куб. м. шчэбеня, а пасьля рацыяналізацыі каля 27 і г. д.

Усе рацыяналізатарскія мерапрыемствы павінны быць распаўсюджаны па ўсіх будаўніцтвах.

Слаба праводзіцца работа па стандартызацыі, вынаходзтву і абмене вопытам. На зьнішчэньне гэтых недахопаў неабходна мабілізаваць увагу ўсіх рацыяналізатараў.

Для таго, каб рацыяналізатарскую работу паставіць на належную вышыню, трэба неадкладна рэалізаваць прынятыя нарадай рацыяналізатараў мерапрыемствы, узмацніць рацыяналізатарскія органы работнікамі, уцягнуць масу дарожных работнікаў у справу рацыяналізацыі і дамагчыся каб рацыяналізацыя стала абавязковай функцыяй кіраўніцкіх дарожных арганізацый.

**Драчоў.**



## Чыгунка тармозіць падачу вагонаў

**Менск. 3-Х.** У Менск павінна прыбываць штодзенна 100 вагонаў дроў, але дастаўка не наладжана. 29-га верасьня прыбыло ўсяго 23 вагоны. Сярэдняя норма штодзеннага завозу не дасягае і паловы вызначанай нормы.

Прычынаю зрываў зьяўляецца тое, **што чыгунка не забясьпечвае леспрамгасы дастатковай колькасьцю вагонаў.** Жыткавіцкаму Леспрамгасу на 29-га верасьня было патрэбна 40 вагонаў. Заходняя-ж чыгунка дала толькі 17.

Яшчэ горш абстаіць справа з забесьпэчэньнем дрывамі Магілёву і Бабруйску, дзе пляны забесьпячэньня выконваюцца толькі на 30 проц. Праяўляюць бязьдзейнасьць і самыя леспрамгасы, якія недастаткова аддаюць увагі вывазцы дроў на месцы пагрузкі.

Бабруйскі леспрамгас выканаў свой плян па вывазцы толькі на 28 проц., Глускі—на 25 проц. і Чачэрскі—на 29 проц. (Белта).

## ЦЭХ грамадзкага харчаваньня НА ТРАНСПАРЦЕ адстае

### На Менскім вузьле грамадзкае харчаваньне зрываецца

Друк ужо ні адзін раз сыгналізаваў аб агідных справах у Менскім ТСТ, але да гэтага часу сыгналы не пачуты. Бюро партячэйкі ТСТ і члены праўленьня не рэагуюць на ўсе допісы, зьмешчаныя ў друку.

Брыгада ЦКК НК-РСІ і газэта «Савецкая Беларусь» праверылі, як выконваецца пастанова партыі аб перабудове работы спажывецкай каапэрацыі, як рэалізуецца пастанова ЦК аб забясьпечаньні грамадзкім харчаваньнем рабочых на Менскім вузьле.

Брыгада сустрэлася з фактамі зрыву грамадзкага харчаваньня на Менскай чыгунцы. Што-ж выявіла брыгада?

У сталоўцы ТСТ № 1 робяцца агідныя справы. Справа ў тым, што сталовая № 1 на станцыі Менск—пас. зьяўляецца камэрцыйнай. Усе прадукты для сталовай купляюцца на прыватным рынку па рыначных цэнах. Адсюль кошт абедаў дасягае 5 руб.

Але знаёмым загадчык сталовай Пякарскі выдае гэтыя абеды замест 5 руб.—за 40 кап. А тлумачыцца гэта тым, што Пякарскі мае свой асобны сьпіс прывілеяваных. Такім чынам, у сталоўцы ТСТ стварылася растрата на 4.800 руб. выключна па віне загадчыка сталоўкі Пякарскага.

Ніхто з супрацоўнікаў сталоўкі ня ўскрываў злачынную дзейнасьць загадчыка. Толькі рабочы—вылучэнец з заводу «Полымя рэвалюцыі» тав. Вэрцінскі аб гэтым узьняў пытаньне. За гэта Пякарскі ставіў пытаньне перад праўленьнем ТСТ аб зьняцьці яго з пасады. Калі старшыня групкому Ендульская і інструктар грамадзкага харчаваньня Вігдорчык на вытворчай нарадзе ўзьнялі пытаньне аб справах сталоўкі, дык Пякарскі сказаў:

— Ніхто ня мае права мяне крытыкаваць, я—сакратар партячэйкі і загадчык сталовай. Што хачу, то і раблю. А цябе Ендульская я выклікаю на бюро, з табой мы пагаворым.

Супрацоўнікі сталоўкі, абураныя гэтым фактам, зварочваліся да старшыні Менскага ТСТ Ашаровіча і Гусаіма, але апошнія ніякай дапамогі не аказалі.

У сталоўцы ТСТ № 4 справы ня лепшыя. Абед гатуецца бяз усякай праверкі: як з боку санітарыі, так і якасьці. На ўсе ўказаньні рабочых аб дрэннай якасьці абедаў, старшыні грамадзкага харчаваньні Гусаім і заг. сталоўкі № 4 адказваюць маўчаньнем.

Такія-ж факты назіраюцца і ў сталовай № 2 і 3.

Паравозныя брыгады не забясьпечаны дабраякаснымі харчамі, грамадзкае харчаваньне пастаўлена так дрэнна, што патрабуе карэннай перабудовы.

У ларках ТСТ пануе самазабясьпечаньне. Працоўнікі ларкоў бяруць для сябе ўсё, што хочуць.

Работа Менскага ТСТ не пастаўлена на службу выкананьня транфінпляну і аздараўленьня транспарту.

Праўленьне Менскага ТСТ не спраўляецца з задачамі, якія высунуты перад транспартнай каапэрацыяй.

Слова за гаркомам партыі, слова—за РСІ і пракуратурай.

**Мельнікаў.**

### ТСТ—твэрам да транфінпляну

Становішча грамадзкага харчаваньня на **Гомельскім чыгуначным вузьле** прымушае жадаць значна лепшага.

Гомельская ТСТ яшчэ не перабудавала сваёй работы паводле апошніх дырэктыў партыі.

Сталоўка ступеньчатага дэпо не забясьпечана адпаведнай колькасьцю рабочых у выніку чаго працуючыя работніцы не спраўляюцца з выдачай абедаў і рабочым, бруднымі рукамі прыходзіцца самім наліваць сабе абеды. Гэта прыводзіць да стварэньня вялікай чаргі, блытаніны, шуму.

Кухар гэтай сталоўкі адпушчае порцыі мяса «на вока», што вядзе да застаўленьня шмат рабочых без абедаў, бо для іх не хапае прадуктаў.

Па віне галавацяпаў з 27-й дыстанцыі і ТСТ на Гомельскім чыгуначным вузьле мае месца такі абураючы факт: **у час самай гарачай работы, у час асеньня-зімовых перавозак паставілі на рамонт сталоўку № 2, якая абслугоўвае рабочых старых дэпо.**

Галавацяпы з 27 дыстанцыі і ТСТ толькі зараз надумалі рамантаваць сталоўку, калі гэта можна і трэба было зрабіць улетку.

Санітарнае становішча сталовак і якасьць абедаў — на вельмі нізкім узроўні. Талеркі чыста не выціраюцца, на кадках няма днушак і іх накрываюць анучкамі і газэтай, пасуду хаваюць у тых-жа самых кадках, у якіх прывозіцца страва і г. д. Буфэт таксама ў надзвычайна антысанітарным становішчы.

Работа Гомельскага чыгуначнага вузла, праходзіць напружанымі тэмпамі. Гомельскія чыгуначнікі змагаюцца за выкананьне адказнейшай задачы, за 100-процантнае выкананьне асеньня-зімовых перавозак і яны ў праве патрабаваць добраякаснага забесьпячэньня, рашучага паваротy транспартнай каапэрацыі на здавальненьне іх патрэб.

**«П. П.».**

## На хаду выправіць памылкі

Жлобінскі аддзел эксплёатацыі да асеньня-зімовых перавозак не рыхтаваўся. А калі і рыхтаваўся, дык вельмі дрэнна. Аб гэтым красамоўна сьведчаць факты з практыкі падрыхтоўкі Жлобінскага аддзелу эксплёатацыі да асеньня-зімовых перавозак. Важнейшыя дырэктывы НК шляхоў зносін аб падрыхтоўчай рабоце да асеньня-зімовых перавозак, не распрацоўваліся і не ажыцьцяўляліся. Інструкцыя НКШЗ аб эксплёатацыйнай рабоце, загад аб хранамэнтажнай рабоце па ўстанаўленьні падстанцыйных норм прастояў вагонаў, загад аб палепшаньні скарыстаньня вагонаў—усё гэта дырэктывы, якія ляжаць пад сукном аддзелу эксплёатацыі.

На справе на чыгунцы наглядаюцца выпадкі, калі вагоны разгружаныя стаяць па некалькі дзён. Вагон № 432987 прастаяў разгружаным на ветцы з 7-га па 13-га верасьня.

Пагрузка і выгрузка дробных грузаў утвараецца праз падачу вагонаў да пакхаўзаў у той час, як гэту апэрацыю трэба ўтварыць на месцы астаноўкі цягніка з тым, каб скараціць стаянку.

У выніку дрэннага кіраўніцтва асеньня-зімовымі перавозкамі рух цягнікоў за жнівень па раскладу выконваецца ўсяго на 76 проц.

Трэба на—ходу выправіць памылкі. Перавозкі ўжо пачаліся.

**Брыгада Жлобінскага РКК—РСІ пракуратуры і газ. «Шлях Сац.».**

# У БОЙ ЗА СТАНДАРТ, ЗА ЯКАСЬЦЬ!

**Месячнік стандартызацыі зрываецца. Апартуністы з Белкаапсаюзу заяўляюць аб сваім нежаданьні разгарнуць работу па стандартызацыі. Дасьледчы інстытут імя Леніна ў галіне стандартызацыі бязьдзейнічае**

## Пагроза зрыву--рэальная

Да канца месячніка стандартызацыі засталося ўсяго некалькі дзён. Як-жа месячнік праходзіць? Паводле тых матар'ялаў, якія ў нас ёсьць, паводле матар'ялаў самаго Стандарткому відаць, што месячнік правальваецца.

Цікава апошняе паседжаньне Цэнтральнага штабу кіраўніцтва месячнікам стандартызацыі ад 2-га кастрычніка. На гэтым паседжаньні былі заслуханы даклады наркаматаў, прафсаюзаў і асобных аб'яднаньняў. З гэтага дакладу чуваць адно:

— Мы толькі разгарнулі работу.

— Мы ня маем вестак з раёнаў і г.д.

Вось заява Белкаапсаюзу: :

— Дырэктывы мы далі. Пажадана месячнік працягнуць. Яшчэ больш пажадана, каб Белстандартком даў нам хоць-бы за плату спэцыяліста...

Тое самае можна было пачуць ад прадстаўніка Наркамасьветы, Лесбелу і іншых арганізацый.

Тав. Герасімовіч—работнік Стандарткому апавядае аб тым, як яго сустрэлі ў Белкаапсаюзе. Тав. Шэйнін (Белкаапсаюз) пасьля таго, як да яго некалькі разоў зьвярталіся наконт месячніка, заявіў:

— Досыць хадзіць вам, вам відаць няма чаго рабіць, а на вашае паседжаньне я хадзіць ня буду.

Па лініі Наркамзему справа абстаіць яшчэ горш. Пытаньне стандартызацыі ў сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі мае вялікае значэньне. Але да гэтага часу навуковыя ўстановы па лініі Наркамзему нічога не зрабілі каб уключыцца ў месячнік стандартызацыі. Інстытут сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі імя Леніна на прапанову заняцца стандартызацыяй, адказвае афіцыйным адносьнікам: «На в-адносіну паведамляю, што ў сувязі з адсутнасьцю адпаведных працаўнікоў, пытаньнямі стандартызацыі інстытут у сучасны момант ня мае магчымасьці займацца». І такую адносіну падпісаў дырэктар інстытуту Пашкевіч і яго сакратар.

У НКАСьветы тав. Ошэраў заяўляе:

— Нам няма чаго рабіць па стандартызацыі.

Месячнік па стандартызацыі цесна ўвязаны з пытаньнямі барацьбы за якасьць. Для прадпрыемстваў гэты месячнік набывае вялікае значэньне. Трэба сказаць, што толькі асобныя заводы і фабрыкі ўключыліся ў месячнік. Работу барацьбы за якасьць праводзяць швэйная фабрыка «Акцябр», Гомельскі завод «Пралетары», скурзавод «Бальшавік» і некалькі іншых прадпрыемстваў. На астатніх прадпрыемствах, згодна інфармацыі прадстаўніка ВСНГ цэлыя аб'яднаньні яшчэ ня ўключыліся ў работу па стандартызацыі, ня ўключыліся ў месячнік.

А разам з тым, на гэтай-жа нарадзе выявіўся цэлы рад фактаў, якія гавораць аб тым, што перад прамысловасьцю і асобнымі наркаматамі высоўваюцца досыць канкрэтныя задачы па стандартызацыі.

## Бязьдзейнасьць, якая мяжуе з апартунізмам

### Стандартызацыя тавараў спажываньня—непасрэдная задача Белкаапсаюзу

Брыгада, вылучаная Белстандарткомам для праверкі ходу месячніка стандартызацыі, канстатуе яўнае нежаданьне Белкаапсаюзу па-бальшавіцку разгарнуць работу па стандартызацыі.

Вось што кажа старшыня штабу месячніка пры Белкаапсаюзе тав. Шэйнін:

— Хоць і ёсьць пастанова прэзыдыюму БКС аб арганізацыі бюро па стандартызацыі, мы гэткага бюро на сёньняшні дзень ня маем. Штаб кіруе работай фармальна. Канкрэтнага зроблена мала. Праектуецца ў кожным аддзеленьні БКС вылучыць працаўніка па стандартызацыі. На сёньняшні дзень яны яшчэ ня вылучаны. Белкаапсаюз спадзяецца, што гэтых працаўнікоў дасьць Белстандартком.

Гэткім чынам, паводле думкі Шэйніна, выходзіць, што стандартызацыя зьяўляецца толькі абавязкам Белстандарткому. Каапэрацыйная сетка, апарат БКС і работа магазынаў застаюцца ў баку ад правядзеньня работы па стандартызацыі. Шэйнін патрабуе перш за ўсё прыслаць спэцаў з Стандарткому, якія па яго думцы будуць займацца гэтай работай.

А вось работы-то гэтай Шэйнін не вядзе да прысылкі спэцаў.

— Вашы пляны і таблілы мы запаўняць ня будзем, так і перадайце камітэту,—заканчвае Шэйнін.

Гэтыя апартуністычныя разважаньні павінны быць спынены. Дырэктывы СНК аб правядзеньні месячніка трэба правесьці ў жыцьцё. Стандартызацыя тавараў шырокага спажываньня—непасрэдная задача работы Белкаапсаюзу.

**Брыгада: Струкоўскі, Бэндзятовіч.**

## З фронту дровазагатовак

ГЛУСК. На 20-га верасьня раёнам падвезена да чыгункі 276 вагонаў дроў і адгружана Менску — 116 вагонаў. Зрываюць падвозку дроў Беразоўскі, Слаўкавіцкі і Капіхаўскі сельсаветы, выканаўшыя свае заданьні ўсяго на 30—40 проц.

Калгас «Чырвоны Гігант», ня гледзячы на нязначную колькасьць гужавой сілы, дзякуючы ўпартай рабоце калгасьнікаў, выканаў свой плян па вывазцы на 106 проц.

Калгас за ўдарную работу па вывазцы дроў атрымаў прэмію, якія разданы лепшым ударнікам.

# Поўнасьцю і ў тэрмін адгрузіць дровы Менску

## Дровазагатоўкам і вывазцы—баявыя тэмпы

## Менск павінен быць забясьпечан дровамі

**Пастанова бюро Менскага гарадзкога камітэту КП(б)Б пра мерапрыемствы па загатоўцы, вывазцы і адгрузцы дроў для гораду Менску**

**Ад 2-га кастрычніка 1931 г**

1. У сувязі з тым, што плян загатоўкі і адгрузкі дроў прымацаванымі да Менску раёнамі сыстэматычна ня выконваецца, за выключэньнем Глускага раёну, прасіць ЦК паставіць гэта пытаньне на Сакратарыяце з выклікам сакратароў РК і старшынь РВК ад гэтых раёнаў.

2. Абавязаць т. Шапіра (Лесбел) у 5-х дзенны тэрмін разьвярстаць паміж леспрамгасамі плян загатоўкі і вывазкі дроў для Менску на кастрычнік месяц. Прасіць ЦК даць паказаньні раёнам, якім дадзена разьвёрстка аб поўным яе выкананьні.

Для прасоўваньня ўсіх пытаньняў, зьвязаных з загатоўкай і падвозкай дроў, камандыраваць у адстаючыя раёны раёнаў ра кастрычнік месяц упаўнаважаных ЦК і СНК наступных т. т. Беркаўскага, Чахоўскага, Палякова, Партнога, Веріна, Ільіна.

3. Лічыць неабходным поўнае выкананьне для падвозкі дроў для Менску на працягу кастрычніка месяца, працуючых зараз трох саставаў цягнікоў—«вяртушак». Абавязаць тав. Сакалова скласьці расклад руху «вяртушак» з такім разьлікам, каб яны паспявалі ся у сутк. ня менш аднаго разу.

4. Даручыць т. т Валодзьку і Сакалову паставіць пытаньне перад ЦК Падываленым (Дырэктарам Заходняй дыгункі) аб прымацаваньні да «вяртушак» паравозаў і брыгад да сталай работы.

Дадатковыя выдаткі, зьвязаныя з прымацаваньнем паравозаў і брыгад, скласьці на Лесаснабзбыт.

Вылучэньне камэндантаў саставаў «вяртушак» даручыць тав. Кудраеву.

5. Даручыць т. Валодзька дамовіцца з тав. Падываленым аб выкананьні апошнім дадзенага ім у ЦК і Гаркоме абяцаньня аб тым, што «лік вагонаў пад пляновую пагрузку дроў для Менску з 29-IX будзе даведзен да 30».

6. Абавязаць тав. Шапіра (Лесбел) у тэрмін прадстаўляць чыгунцы заяўкі на вагоны для ўсёй плянавай перавозкі дроў.

7. Лічыць неабходным увесьці прэм'яваньне за пасьпяховы зварот «вяртушак» дыспэтчарскага апарату, машыністаў, працуючых на «вяртушках» і асобных работнікаў спрыяўшых пасьпяховаму звароту «вяртушак».

Даручыць камісіі ў складзе т. т. Шаевіча, Кудраева, Ліпкіна і Сакалова распрацаваць умовы прэм'яваньня.

8. Лічыць неабходным водпуск для мэт прэм'яваньня з Белпайгандлю і МЦРК ня менш 100 касьцюмаў, 100 пар бацінак, 100 пар бялізны, 15—20 па літо і пэўную колькасьць дробных дэфіцытных тавараў, кантынгент якіх даручыць устанавіць паказанай камісіі.

9. Канстатуючы несваячасовую разгрузку прыбываючых на ст. Менск вагонаў з дрывамі (па 5—6 гадзін), абавязаць т. Крылова (Саюзтранс) выканаць пастановы СНК аб арганізацыі арцеляй па выгрузцы і развозцы дроў.

Даручыць т. Кудраеву прасачыць за тым, каб прыбываючыя на ст. Менск вагоны з дрывамі разгружаліся не пазьней як праз 2 гадзіны арганізуючы ў патрэбных выпадках дапамогу Саюзтрансу рабочай сілай.

10. У мэтах паскарэньня зваротy «вяртушкі», дровы адрэсаваныя дробным кліентам разгружаць у адным месцы.

11. Абавязаць тав. Млодака (Нач. гарадзкой міліцыі) па дамоўленасьці з адміністрацыяй ст. Менск устанавіць варты па ахове выгружаных дроў.

Выдаткі па ўтрыманьні варты ўскласьці на арганізацыі, у адрас якіх паступаюць дровы.

12. Прыняць наступныя прынцыпы пры ўстанаўленьні чарговасьці адгрузкі дроў:

а) у першую чаргу здавальняюцца патрэбы ўстаноў грамадзкага харчаваньня, лячэбніцы, школы, дзетдамы, пайнікі ЦРК і ЗРК (рабочыя, служачыя), прадпрыемствы (ф-кі і з-ды);

б) у другую чаргу установы.

У сувязі з гэтым абавязаць тав. Марона (Лесбел) павялічыць адгрузку дроў у адрас МЦРК, ЗРК і Белпайгандлю да 50 проц. усёй колькасьці адгружаных дроў.

13. Абавязаць Лесрабкаап, пад асабістую адказнасьць тав. Кліенскага атрыманыя ад Белпайгандлю прамтавары на суму 120 тысяч рублёў у 2-х дзённы тэрмін разьвярстаць і прасунуць у раёны дровазагатовак для Менску (Клічаў, Бабруйск, Глуск, Асіпавічы, Парычы, Калінкавічы, Петрыкава, Жыткавічы).

Адначасова прыняць да ведама заяву тав. Шаевіча аб тым, што Белгандаль дадаткова вылучае прамтавараў на суму 30 тысяч рублёў для прасоўваньня ў раёны дровазагатовак, прымацаваныя да Менску.

14. Абавязаць т. Сакалова даць паказаньні адміністрацыі станцыі аб тым, каб адпраўляньня ў раёны грузытавары для стымуляваньня дровазагатовак прымаліся-б бяз усякай чаргі.

15. У сувязі з тым, што неадпраўленыя дырэктывы ЦК і ЦКК аб скарыстаньні па прызначэньні вылучаных фондаў для стымуляваньня дровазагатовак, сыстэматычна парушаюцца, прасіць Пракурора Рэспублікі і ЦКК-РСІ праверыць скарыстаньне на месцах пакаазных фондаў, прыцягнуўшы да адказнасьці вінаватых у парушэньні дырэктыў партыі.

# ПЕРАМОГА ШВЭЙНІКАЎ-

## вынік барацьбы за генэральную лінію партыі

## „Уздымеце волю і энэргію для канчатковай перамогі сацыялізму"

**Прывітаньне ЦВК БССР**

**Прэзыдыум Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР горача вітае рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал швэйнай прамысловасьці БССР з пасьпяховым выкананьнем пяцігадовага пляну ў тры гады.**

**Гэта перамога на фронце сацбудаўніцтва зьяўляецца вынікам гераічнай барацьбы і работы пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, на падставе шырокага разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва і зьяўляецца найлепшым паказальнікам рашучага змаганьня за генэральную лінію партыі і руйнуючым ударам па ўсіх апартуністых, малаверах і іншых ворагах сацыялістычнага будаўніцтва.**

**Гэта перамога павінна ўзьняць нашу волю і энэргію для далейшага разгортваньня сацбудаўніцтва і нясупынай барацьбы за канчатковую перамогу сацыялізму.**

**Няхай жыве перамога сацыялізму!**

**Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!**

**Няхай жыве камуністычная партыя і яе ленінскі ЦК!**

**Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.**

**Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР Б. ВАНСОЎСКІ.**

## Наперад, да новых перамог

**Да ўсіх рабочых, камуністаў, камса мольцаў і адм.-тэх. пэрсаналу чырвонасьцяжнай фабрыкі «Акцябр».**

Менскі гарадзкі Камітэт КП(б)Б шле бальшавіцкае прывітаньне парт-арганізацыі, рабочаму калектыву і адм. тэхпэрсаналу Чырвонасьцяжнага «Акцябра», забясьпечыўшых выкананьне швэйнай пяцігодкі ў 3 гады.

Перавыкананьнем колькасных паказьнікаў на 121 проц., падвышэньнем прадукцыйнасьці работы на 240 проц. у 3 гады замест 155 проц. у 5-ці годку, зьніжэньнем сабекошту да 22,3 проц. за 3 гады замест 18,3 проц. у 5-ці годку, рабочыя «Акцябра» на справе паказалі як патрэбна змагацца за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы, за выкананьне паказаньняў тав. Сталіна.

Сваёй перамогай рабочыя швейнікі «Акцябра» упісалі яшчэ адну слаўную старонку ў гісторыю вялікай барацьбы за завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі Савецкай Краіны ў 3-м рашаючым годзе пяцігодкі.

Буйная перамога, атрыманая вамі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва абавязвае вас з падвойнай энэргіяй згуртаваць ўвесь калектыў для барацьбы за новыя яшчэ больш высокія ўзоры работы, за аўладаньне тэхнікай, за выхаваньне новых кадраў, бязьлітасна адмятаючы са шляху сацыялістычнага наступленьня элемэнты правага апартунізму, ныцьця, малавер'я, і ўсё тое, што перашкаджае пераможнаму змаганьню за ўзмацненьне заваёў Акцябра.

Менгарком упэўнен, што рабочыя «Акцябра», уступаючы ў барацьбу за 2-ую пяцігодку, пад кіраўніцтвам ЦК, Менгаркому і сваей парт-арганізацыі, разгарнуць яшчэ больш шпаркія тэмпы работы і пакажуць новыя ўзоры бальшавіцкага змаганьня за генэральную лінію партыі.

**У бой за другую пяцігодку!**

**Наперад, да новых перамог!**

Сакратар Менгаркому КП(б)Б Кавальчук.

## Прывітаньне ад СНК БССР

**рабочым, работніцам, адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу, партыйным і прафсаюзным арганізацыям швэйнай прамыслоасьці БССР**

**Вітаю вас, таварышы, з выкананьнем пяцігодкі за тры гады. Гэтае вялізарнае дасягненьне на фронце сацыялістычнага будаўніцтва зьяўляецца вынікам вытворчага энтузіязму і бальшавіцкай работы рабочых, работніц, адміністрацыйна - тэхнічнага пэрсаналу, партыйных і прафсаюзных арганізацый швэйнай прамысловасьці, якія ў барацьбе за генэральную лінію партыі паказалі сапраўды бальшавіцкія тэмпы працы і высока трымаюць сьцяг сацыялістычнай індустрыялізацыі краіны.**

**Ваша перамога зьяўляецца перамогай ленінскай партыі, савецкай ўлады, усяе рабочае клясы БССР.**

**Выказваю ўпэўненасьць, што вы яшчэ з большым энтузіязмам выканаеце і перавыканаеце пляны IV кварталу 1931 г., а таксама арганізавана возьмецеся за складаньне і выкананьне другой пяцігодкі, рашуча ажыцьцяўляючы ўсе дырэктывы правадыра камуністычнай партыі тав. Сталіна.**

**Наперад, да новых перамог!**

**Старшыня савету народных камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.**

ФІНПЛЯН

# Барацьба за фінплян--барацьба за „518“ і „1040“

**Саветы і фінорганы павінны змагацца за пасьпяховую мабілізацыю сродкаў у сацыялістычным і аднаасобным сэктары, за давядзеньне цьвёрдых заданьняў да кулацка-заможных гаспадарак, за рэалізацыю ўсіх відаў пазыковых аперацый**

**Узяць прыклад перадавых саветаў Аршанскага раёну, перавыканаўшых фінплян 3 кварталу**

| Чырвоная дошка | | |
|---|---|---|
| раёнаў перавыканаўшых фінплян 3-а кварталу | | |
| 1. Сіроцінскі раён | 130,4 | проц. |
| 2. Аршанскі „ | 110,8 | „ |
| 3. Гомельскі „ | 104,4 | „ |
| 4. Любаньскі „ | 101,7 | „ |

| Чорная дошка | | |
|---|---|---|
| раёнаў, якія ганебна адсталі ў выкананьні фінпляну: | | |
| 1. Асьвейскі раён | 58,8 | проц. |
| 2. Бягомльскі „ | 56,5 | „ |
| 3. Плешчаніцкі „ | 55,3 | „ |
| 4. Расьнянскі „ | 59,9 | „ |

## Ударнікі па мабілізацыі сродкаў прэміраваны

ВОРША. (Ад наш. кар.). Плян па мабілізацыі сродкаў у III-м квартале па раёне выкананы на 110,8 проц. Гэтыя вынікі атрыманы толькі дзякуючы ўпартай рабоце паасобных сельсаветаў і вылучаных таварышоў для правядзеньня гэтай кампаніі. Раённая камісія садзейнічаньня лепшых ударнікаў фінансавага фронту прэм'явала.

Прыміраваны т. т. Шчэрбакоў—старшыня Зубраўскага сельсавету—200 руб., Ермаленка—старшыня Кудаеўскага сельсавету—150 руб., Новікаў—старшыня Зубаўскага сельсавету—100 руб., Грынблат—старшыня Пішчалкаўскага сельсавету—150 руб., Каржэўскі — старшыня камсоду, Пішчалаўскага сельсавету—50 руб.

Камсамол хлебазаводу і камсамольская ячэйка хлебазаводу за выкананьне пляну па рэалізацыі пазыкі прэм'яваны, камсод на 150 руб., ячэйка—100 руб. Камсод спраўдому і базы Белкаапсаюзу прэм'яваны па 100 руб. кожны.

За актыўны ўдзел у справе мабілізацыі сродкаў рэалізацыі пазыкі і продаж яе за гатоўку па горадзе і вёсцы прэм'яваны: загадчык аддзелу дзяржпазык Аршанскага аддзяленьня дзяржбанку тав. Янкоўскі на 150 руб., інспэктар дзяржбанку тав. Барташэвіч—75 руб., т. Малачынскі — 100 руб., т. Жабраў (Гарсавет)—75 руб. т. Гом зан (Райпрафсавет)—75 руб. Кляцкоў (Ашчадкаса)—100 руб., Студзянцоў (Пошта)—75 руб. Энівін—75 руб., Фэйфіш—75 руб., Райпш—75 руб.

Прэм'яваныя таварышы ў III квартале 3-га рашаючага за бальшавіцкую работу на фінансавым фронце, не павінны паслабляць сваіх тэмпаў у рабоце па мабілізацыі сродкаў і ў чацьвертым квартале.

А. Кудрын.

## Перадавыя сельсаветы Шклоўшчыны, барэце на грамадзкі буксір адстаючых

Выкананьне пляну 3-га кварталу па Шклоўшчыне прайшло яўна нездавальняюча. Квартальны плян выканан на 67,8 проц., а па асобных паказьніках справа яшчэ горш. Сельгаспадатак выкананы на 31 проц., страхоўка—32 проц., акцыі трактарацэнтру—21,8 проц., укклады ў ашчадкасу—27 проц., аформлена пазыка 3-га рашаючага году на 37 проц. Па самазабкладаньні трэ'было спагнаць у III-м квартале 89.100 р., спагнана толькі 3.958 руб.

Тыя сельпо і сельсаветы, якія па бальшавіцку змагаюцца за выкананьне фінпляну, маюць значныя посьпехі у гэтым пытаньні. Возьмем Загоранскае сельпо якому было заданьне сабраць палавы узносаў 3800 руб—сабрана 3463 руб. альбо 91,1 проц., па мэтавых укладах перавыкананьне заданьне на 104 проц. З гэтага відаць, што асобныя сельпо па ўдарнаму змагаюся за выкананьне фінпляну ў III-м квартале. Недавыкананьне фінпляну па раёне тлумачыцца тым, што старшыні сельсаветаў у большасьці спадзяюцца на самацёк, чакаюць пакуль прынясуць ім грошы самі сялане, не мабілізаваўшы грамадзкасьць на гэту кампанію. Не арганізаваны брыгады з актыву па асобных калгасах і вёсках з мэтай падворнага абыходу кожнага неплацельшчыка. Не зроблены рашучы націск на кулацка-заможную частку, у выніку чаго кулакі не вдалі поўнасьцю плацяжоў. Напрыклад, падатку на кулакоў накладзена па раёне 34983 р., а спагнана 19.944 руб., таксама і па астатніх паказьніках. Райфінаддзел ня ведае у якім сельсавеце ёсьць запаз зычанасьць за кулакамі.

У перыяд 4-га кварталу 3-га рашаючага году на фінансавы фронт павінны быць кінуты ўсе грамадзкія сілы з тым, каб прарыў у III-м квартале быў ліквідаваны і плян 4-га кварталу—поўнасьцю выкананы.

Г. Ш.

## Лёзна не павінна адставаць

Па Лёзьнянскім раёне мабілізацыя сродкаў у 3-м квартале праходзіла далёка не здавальняюча. Квартальны плян па раёне выкананы усяго на 67,7 проц. У сельсаветах, разгорнутых сапраўдна бальшавіцкія тэмпы, мабілізаваны ўвесь актыў і наладжана масавая работа сярод калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі. Гэтыя сельсаветы ідуць ўперадзе па мабілізацыі сродкаў. Высачанскі сельсавет перавыканаў плян на 136 проц. і Лёзьнянскі—на 112 проц.

Але разам з гэтым рад сельсаветаў знаходзіцца ў ганебным тыле з мабілізацыяй сродкаў. Так Бабінаўскі сельсавет выканаў плян 3-га квартала на 57 проц. Чарніцкі, Асінаўскі і Крынкаўскі сельсаветы зусім не праводзілі ніякай работы ў гэтым напрамку і процант выкананьня пляну ня значны.

Недапушчальным тэмпам праходзіць выкананьне фінпляну па асобных паказьніках па раёне. Рэалізацыя пазыкі 3-га рашаючага года пяцігодкі выканана на 37,4 проц. Укклады ў ашчадкасы складаюць 8,1 проц., мэтавыя пазыкі—20,3 проц., па паляўнічай каапэрацыі—20,9 проц., па Спажыўкаапэрацыі—35,3 проц. і па распаўсюджваньні акцый трактарацэнтру на 38,5 проц. Фонд доўгатэрміновага крэдыту выкананы на 16,3 проц. З боку Райкалгассаюзу да гэтага часу ня зроблена паказаньняў па калгасах адносна адлічэньня 25 проц. ад уступных узносаў на ўклады і ашчадкасы.

Да гэтага часу рад сельсаветаў замест націску на кулака, прыняцця жорсткіх мер да яго, праяўляюць сваю слабасьць. Партыйныя ячэйкі на мясцох ня сталі на чале кіраўніцтва гэтай работай, не мабілізавалі вакол гэтай кампаніі калгасы і бядняцка-серадняцкі актыў для практычнага ўдзелу ў гэтай кампаніі.

Райспажыўсаюз, Райкалгассаюз і Райашчадкаса па апартуністычнаму адносяцца да гэтага пытаньня, і ня прымаюць мер для разгортваньня масавай работы і набыцьця ўдарных тэмпаў у гэтай кампаніі. Фінансавакрэдытныя арганізацыі раёну не скарысталі ўсіх магчымых мер фінансавага ўзьдзейнічаньня для прыцягненьня да адказнасьці зрыўшчыкаў фінпляну. Выкананьню фінпляну перашкаджае слабая фінансавая дысцыпліна ў радзе зьвеньняў раёну.

Райпрофсавет і Райком КСМ прымаюць слабы удзел у разгортваньні гэтай кампаніі. Ня поўнасьцю мабілізаваны ўвесь наяўны прафсаюзны і камсамольскі актыў на ліквідацыю прарыву на фінансавым фронце.

Сямён Вольны.

## Ліквідаваць апартуністычныя адносіны да мабілізацыі сродкаў

Работа Капыльскіх раённых і мясцовых арганізацый па выкананьні фінпляну ў 3-м квартале 3-га рашаючага году пяцігодкі не адпавядала бальшавіцкім тэмпам. Як раённыя арганізацыі, так і мясцовыя не мабілізавалі вакол гэтага пытаньня грамадзкасьць, работа праходзіла самацёкам, з прычыны чаго маецца вялікі прарыў на фінансавым фронце.

РВК гэтага пытаньня ня высоўвае ў гушчы мас, абмяжоўваецца фармальным разглядам яго толькі на прэзыдыуме, упаўнаважаныя РВК пры сельсаветах па гаспадарча-палітычных кампаніях, работу па мабілізацыі сродкаў ня ўвязваюць з іншымі кампаніямі.

Слабую работу па мабілізацыі сродкаў у 3-м квартале характарызуюць наступныя паказьнікі: па с. г. падатку плян выкананы на 31,8 проц., па страхоўцы—9,9 проц., па афармленьні пазыкі—6,3 проц., таксама нязначны процант выкананьня і па іншых плацяжох. Лічбы гавораць самі за сябе.

Наглядаецца слабы націск на кулацка-заможную частку вёскі. Акты на кулакоў за няўплату с. г. падатку ня складзены і кулакі не аштрафаваны. Па лініі Дзяржбанку ёсьць вялікая запазычанасьць па пазыцы за кулацка-заможнай часткай вёскі.

Копыльскі РВК у свой час атрымаў належнае пакараньне за рэдакцэнку гаспадарча-палітычнага значэньня пытаньня мабілізацыі сродкаў, але ён усё яшчэ працягвае работу ў гэтым пытаньні па старому.

Раённы камітэт партыі павінен у бліжэйшы час гэтым пытаньнем заняцца. Адпаведным людзям у зрыве выкананьня фінансавага пляну трэба даць па заслугах.

Бруштэйн.

## Палажэньне
### пра саветы культурнага будаўніцтва
**пры Народным Камісарыяце Асьветы, раённых выканаўчых камітэтах і гарадзкіх саветах БССР**

1. У задачы саветаў культурнага будаўніцтва ўваходзяць:

а) разгляд і каардынацыя плянаў культурнай работы ўсіх дзяржаўных, прафсыяльных, кааперацыйных і іншых арганізацый і установаў у галіне ўсеагульнага і масавага завочнага навучаньня, масавай палітасьветнай і дашкольнай працы, ліквідацыі няпісьмен насьці, змаганьня з бяспрытульнасьцю, аўладаньня тэхнікаю, дапамогі падрыхтоўцы кадраў і г. д.;

б) дапамога выкананьню ўсімі арганізацыямі і ўстановамі, якія вядуць культурную работу, адзінага пляну і арганізацыя масавага грамадзкага кантролю за выкананьнем пастаноў Ураду ў галіне культурнага будаўніцтва праз арганізацыю культпаходаў, культэстафэт і іншых форм масавага ўдзелу працоўных у культурным бадаўніцтве;

в) складаньне адзінага фінансавага пляну культурнага будаўніцтва.

2. На чале савету культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы БССР стаіць Народны Камісар Асьветы. На чале савету культурнага будаўніцтва пры раённым выканаўчым камітэце стаіць раённы інспэктар народнае асьветы, а савету культурнага будаўніцтва пры гарадзкім савеце—член прэзыдыуму гарадзкога савету.

Саветы культурнага будаўніцтва пры сельскіх (местачковых) саветах зьяўляюцца сэкцыямі гэтых саветаў і арганізуюцца і дзейнічаюць паводле «Палажэньня пра сэкцыі пры сельскіх і местачковых саветах» (Збор З. БССР за 1931 г., № 31, паст. 209).

3. Савет культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы складаецца з прадстаўнікоў наступных установаў у колькасьці: 10 прадстаўнікоў НК Асьветы, 1—Культпропу ЦК КП(б)Б, 2—ЦК ЛКСМБ, 1—НКЗ, 1—НКАЗ, 1—Дзяржпляну, 3—БВА, 10—ЦСПСБ і ЦК Саюзаў, 1—Белкавапсаюзу, 1—Белкалгасцэнтру, 1—Белжылсаюзу, 1—Белсампрамсаюзу, 1—БАН, 3—цэнтральных газэт БССР, 1—Т-ва «Прэс Няпісьменнасьць», 1—Асоавіяхіму, 1—МОПР, 1—Т-ва «Прыхільнік Дзяцей», 1—Аўтадору, 1—Белдзяржвы давецтва, 1—Белдзяржкіно, 1—Радыёцэнтру, 1—Нацкамісіі, 5—Пралетстуду, 1—Сэкцыі навуковых працаўнікоў, 20—рабочых з выворчасьці і 10 калгасьнікаў.

4. Саветы культурнага будаўніцтва пры раённых выканаўчых камітэтах і гарадзкіх саветах складаюцца з прадстаўнікоў культасьветных, партыйных, камсамольскіх, прафсыяльных і іншых грамадзкіх арганізацый і ўстаноў, якія вядуць культасьветную працу, і з прадстаўнікоў рабочых і калгасьнікаў.

Парадак арганізацыі саветаў і колькасьць прадстаўнікоў вызначаецца раённымі выканаўчымі камітэтамі і гарадзкімі саветамі і ня можа перавышаць: для саветаў пры раённых выканаўчых камітэтах і Менскім, Віцебскім і Гомельскім гарадзкіх саветах—50 чалавек, пры іншых гарадзкіх саветах—35 чал.

5. Пленумы саветаў культурнага будаўніцтва склікаюцца: Савету культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы—ня менш трох разоў у год, а іншыя—ня менш аднаго разу ў 2 месяцы.

6. Для ажыцьцяўленьня сваіх пастаноў у час паміж пасяджэньнямі пленумаў саветаў і для нагляду за выкананьнем гэтых пастаноў установамі і арганізацыямі, прадстаўнікі якіх уваходзяць у саветы, саветы культурнага будаўніцтва выбіраюць з свайго складу прэзыдыум у складзе: Савет культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы.—15 чал., пры раённых выканаўчых камітэтах і гарадзкіх саветах — ад 7 да 11 чал.

7. Пастановы саветаў культурнага будаўніцтва зацьвярджаюцца: Савету культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы—Народным Камісарам Асьветы, іншых — прэзыдыумамі раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў.

8. Савет культурнага будаўніцтва, зьяўляючыся штабам адзінага культпаходу, праводзіць усю работу праз спэцыяльныя сэкцыі па асноўных галінах культурнага будаўніцтва, як: сэкцыі дашкольнага паходу, сэкцыі па ліквідацыі няпісьменнасьці, сэкцыі па ўсеагульным навучаньні, сэкцыі бібліятэчныя і распаўсюджваньня друку, сэкцыі па змаганьні з бяспрытульнасьцю і сэкцыі па каштарысна-фінансавых пытаньнях.

Могуць таксама арганізоўвацца і іншыя сэкцыі.

9. Саветы культурнага будаўніцтва пры гарадзкіх саветах арганізуюцца на правах сэкцый гэтых саветаў. У склад сэкцый культурнага будаўніцтва з правам пастаноўчага голасу, уваходзяць члены саветаў, якія працуюць у галіне культурнага будаўніцтва і зацьвярджаюцца адпаведнымі гарадзкімі саветамі.

10. На чале паасобных сэкцый саветаў культурнага будаўніцтва стаяць, вылучаныя прэзыдыумам савету члены савету культурнага будаўніцтва.

11. Кожны член савету павінен працаваць у адпаведнай сэкцыі. У склад сэкцыі могуць уваходзіць прадстаўнікі зацікаўленых арганізацый і ўстаноў з дарадчым голасам.

12. Асноўнымі мэтадамі ў рабоце саветаў павінна быць шырокае разгортваньне культпаходу на аснове сацыялістычнага спаборніцтва, ударніцтва, грамадзкага буксіра і г. д. У выкананьні паасобных заданьняў саветы культурнага будаўніцтва шырока ўцягваюць пралетарскую грамадзкасьць.

13. Кожны член савету павінен несьці адпаведную работу па заданьні савету, прэзыдыуму ці сэкцыі; аб сваёй рабоце ён робіць справаздачу перад саветам і перад той арганізацыяй, якая яго паслала. У выпадку безьдзейнасьці член савету можа быць адкліканы той арганізацыяю, якая яго паслала.

14. Савет культурнага будаўніцтва пры Народным Камісарыяце Асьветы выбіраецца на два гады, іншыя саветы выбіраюцца на тэрмін дзейнасьці раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР **Г. Грысевіч.**

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Б. Вансоўскі.**

15 верасьня 1931 г.
гор. Менск.

## Пастанова Савету Народных Камісараў БССР
**ПРА ДАПАЎНЕНЬНЕ АРТ. 17 ПАСТАНОВЫ ПРА АЎТАРСКАЕ ПРАВА ПУНКТАМІ «К» І «Л»**

Савет Народных Камісараў БССР **пастанаўляе** дапоўніць артыкул 17 пастановы СНК БССР «Пра аўтарскае права» (З. З. БССР 1929 г., № 2, паст. 8 і 1931 г., № 20 паст. 158) п. п. «к» і «л» у наступнай рэдакцыі:

«к) за музыку, спэцыяльна напісаную да пэўнага фільму,—адзін процант за збору за кожны сэанс, а за зборную музыку—чвэрць процанту за кожны сэанс для ўсіх аўтараў музыкі;

«л) за публічнае выкананьне гукавых кіно-фільмаў—тры процанты за збору за кожны сэанс для ўсіх аўтараў гукавога кіно-фільму».

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. Галадзед.**

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнага Савету БССР **С. Канцыбовіч.**

3 кастрычніка 1931 г.
г. Менск.

Капыльскі Райзагс паведамляе, што ад гр—на х Шастакі, Ланцуцкага сельсавету, Капыльскага раёну, Жука Станіслава і Язэпа Іванавых паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Жук» на «Жукаўскі». Асоб якія маюць пратэсты супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць аб гэтым Капыльскі Райзагс, паказаўшы свае імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца працы.

Здача малака ў калгасе

# ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

## На зьлёце чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў г. Менску

30-га верасьня адбыўся другі зьлёт чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў г. Менску. На зьлёце стаяла пытаньне аб міжнародным становішчы і аб удзеле чырвоных партызан і чырвонагвардзейцаў у сацыялістычным будаўніцтве.

З дакладам аб міжнародным становішчы выступіў тав. Ярышаў.

Даклад тав. Ярашава выклікаў гарачыя спрэчкі. Выказалася 17 асоб. Большасьць выступаючых таварышоў выказалася за тое, што паасобныя арганізацыі недастаткова аддавалі ўвагі рабоце сярод партызан.

На зьлёце створаны штаб з 11 асоб па правядзеньні штурмавых суботнікаў па ліквідацыі прарываў у выкананьні прамфінпляну прадпрыемствамі і калгасамі, прычым удзельнікі зьлёту абвясьцілі сябе ўдарнікамі штурму. Кожны выхадны дзень партызаны павінны скарыстаць на грамадзка-карысную работу.

З мэтай узмацненьня абароназдольнасьці краіны, зьлётам пастановлена прыступіць да збору сродкаў на пабудову танка «Чырвоны партызан» і чырвонагвардзеец Беларусі» і пабудову дырыжабля імя Леніна.

Зьлёт абавязаў усіх партызан, зьвязаных з сельскай гаспадаркай, у бліжэйшы час уступіць у калгас. Для падвышэньня агульнай і палітычнай пісьменнасьці чырвоных партызан пастановлена ахапіць апошніх сёткай вячэрніх школ.

Зьлёт вынес рашучы пратэст супроць зьверскіх зьдзекаў польскага фашызму над палітзьняволенымі Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны і Польшчы. Прынята пастанова зрабіць суботнік і вырученыя грошы перадаць у карысьць МОПР-у.

Ад імя зьлёту паслана прывітальная тэлеграма чырвоным партызанам Харкаву і Масквы.

Нікіцін.

## Слухайце па радыё, перадачы праз Менскую радыёвяшчальную станцыю імя СНК БССР

**Панядзелак, 5-га кастрычніка**

| | |
|---|---|
| 6-00 | Фізкультура і раніш. навіны (Трансляц. Масквы). |
| 9-00 | Перадача радыёграм. |
| 11-00—13-00 | Рабочы поўдзень (Трансляц. Масквы). |
| 17-25 | Весткі аб надвор'і. |
| 17-30 | Канцэрт для выхадніковуі і пазьмен. рабочых. |
| 18-30 | Радыё-газэта на яўрэйскай мове «Ленінскі шлях». |
| 19-00 | Р.-г. «Піянэр-Беларусі» з музыч. ілюстрац. |
| 19-30 | Р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы». |
| 20-05 | Музычны адпачынак. |
| 20-10 | Р.-г. «Камсамолец Беларусі». З вайсковай старонкай. |
| 20-45 | Р.-г. «Калгасны заклік». |
| 21-25 | Музычны адпачынак. |
| 21-30 | Гутарка дому Мэдэнасьветы. |
| 22-10 | Перадача на мове эсперанта. |
| 22-30 | Канцэрт. |
| 23-30 | Вячэрні выпуск р.-г. «За бальшавіцкія тэмпы». |

## АПАВЯШЧЭНЬНЕ

Парт. тройка Гар. КК КП(б)Б выклікае на 5-X—31 г. у 6 гадзін увеч. (Энгельса, 28) на паседжаньне парт. тройкі наступных т. т.: Іванова П. М., Івашкевіча (ф-ка «Утыль»), Вісакінскага Я. Я. (Белкаапсаюз), Валасевіча М. П. (Гаржылсаюз). Мітэльмана З. М. (Завод «ДА», Берына (Камвуз), Пінхасіка (Гаркамгас), Бэргмана (Гаркамітэт узаемадапамогі), Рудзіцкага (завод Камунар), Апалонава Е. П. (Чырвоны Хімік), Бєліша (Шклозавод), Леановіча (Хэмфармазавод), Барэйша Н. С., Аглушэвіча П. К., Заштофта С. К., Ліўшыца С. Г., Копця Р. М., для разгляду іх справ. Таксама выклікаюцца сакратары ячэек, дзе гэтыя т. т. знаходзяцца на вучоце. Яўка ўсіх абавязкова.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.


**ДА УСІХ ЧЛЕНАЎ БелЛАЧАФ.**

Рыхтуецца да друку другі нумар зборніку

**„БелЛАЧАФ“**

Просьба ўсе матэрыялы (нарысы, апавяданьні, вершы і інш.) накіроўваць: Менск, Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі, вайсковы сэктар, „БелЛАЧАФ“.

ОРГБЮРО.

Беларускі Другі Дзяржаўны Тэатр

**АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ**

акторaў (8) і супрацоўнікаў мужчын (12) і жанчын (4)

Прыёмныя іспыты адбудуцца ў Гомелі 12 кастрычніка, а 11 гад. удзень.

Асобы, якія жадаюць паступіць як акторы, павінны падрыхтавацца па ўласным выбары адпаведны матар'ял для устаноўленьня іх кваліфікацыі.

Асобы, якія жадаюць паступіць як супрацоўнікі, павінны падрыхтавацца: 1 Апавяданьне альбо верш драматычнага зьместу. 2. Байку, жарт, або гумарыстычнае апавяданьне. 3 Прасьпяваць па ўласным выбары (хто сьпявае) Выбар экзаменацыйнага матар'ялу можа быць на толькі ў беларускай мове, але і ў расійскай, яўрэйскай і іншых

Заявы перасылаць: Менск, Пляц Волі, НК Асьветы Галоўмастацтва, БДТ-2 а з 6-га кастрычніка, Гомель, БДТ-2.

Дырэктар В ВОЛЬСКІ. Маст. Кіраўнік М. МІЦКЕВІЧ.

Усе ўстановы і арганізацыі, якім патрэбны

**АРЫФМОМЭТРЫ,**

пэ інны прадставіць свае абгрунтаваныя заяўкі на 32 г, не пазьней 8-га КАСТРЫЧНІКА гэтага году ў

Оргбуд, Менск, Савецкая 55.

Заяўкі, прадстаўленыя пасьля паказанага тэрміну, разглядацца ня будуць

Белоргбуд.

„САЮЗСЕЛЬЭЛЕКТРА“

**АБВЯШЧАЕ НАБОР**

у школу вучнёўства па электрыфікацыі сельскай гаспадаркі (электрасельвуч) у г. Менску.

Курс навучаньня паўтара гады. Патрэбна адукацыя за 4-х годку і ўзрост ад 16 гол. Школа рыхтуе электраманцёраў. Вучні атрымліваюць стыпэндыю (52 ру . 25 к у м-сяц).

Заявы са спраўкай аб адукацыі і соцпаходжаньні падаваць да 25-га кастрычніка на адрас: Менск, Савецкая, № 68. Дом Пісьменьніка Загадчыку сэкт. кадраў В. Залацка у.

БЕЛКАНТОРА САЮЗСЕЛЬЭЛЕКТРА

Загадчык сэктару кадра ЗАЛУЦКІ

На падставе пастановы НК Працы БССР ад 31-VIII—1931 г. за № 38, абвешчанай у газэце „Сав. Бел.“ за № 205 ад 6-IX г. г. аб вучоце працуючых пэнсыянэраў, Менгарстрахкаса прапануе ўсім наймальнікам-страхавальнікам гор. Менску і раёну

ПАЧЫНАЮЧЫ з 1-X—1931 г.

у абавязковым парадку прадстаўляць у страхкасу разам з разьлікавай ведамасьцю страхавальніка

ЗЬВЕСТКІ АБ ПРАЦУЮЧЫХ У ІХ ПЭНСЫЯНЭРАЎ СТРАХКАСЫ

па наступнай форме:

| №№ п. ч. | Прозьвішча, імя і па бацьку | № яго асабовай пазн. карткі | Зарплата за справазд. месяц | З якога часу працуе | Калі звольнены |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Мартычаў Мікалай Васілеў | 120-п | 75 р. | 20-IX | — |
| 2 | Купрыянаў Пётра Янкаў | 1250 | — | — | 6-IX |

Подпіс адказнай асобы прадпрыемства ад. установы.

УВАГА: У выпадку, калі ў прадпрыемстве альбо ўстанове за справаздачны месяц не працавалі пэнсыянэры, спецыяльна зазначыць гэтую ўдзнаку на адвароце статтаёўку „У справаздачным месяцы пэнсыянэры не працавалі“.

За непрадстаўленьне патрэбных зьвестак аказаных за гэта асобы будуць аштрафаваны як за непрадстаўленьне ведамасьцей.

Менгарстрахкаса.


| | |
|---|---|
| КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА | Новы мастацкі фільм па раману Фадзеева „РАЗГРОМ“ пач. а 7 гадз. Каса а 5 гадз. |
| КІНО ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ | Мастацкі фільм ЛЕДЗЯНЫ ЛЁС Працуе з 12 гадз. дня |
| КІНО „ПРАЛЕТАРЫ“ | Мастацкі фільм ГАРАДЫ І ГОДЫ Пачатак і сэансу а 2 гадз дня |
| „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА“ | Дуглас Фэрбенкс СЫН ЗОРА. Пачатак а 7, 8,45 і 10,30. Каса ад 5 г. |

Яўрэйская камэра нарсуду гор. Менску, на падставе прысуду ад 12-V-31 году па 196 арт. Кр. Код., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку разьлічнога цэху фармазаводу Левіну Абраму Абрамавічу за тое, што атрымаўшы 28 балёнаў боткінскіх кропель, сярод якіх меўся балён настойкі опіуму, ён не праверыў надпісу і аддаў для расфасоўкі, дзякуючы чаму атрымалася страта на 20 кілё настойкі опіуму.

Нарсуд Узьдзянскага раёну, на падставе прысуду, па справе № 122 па арт. 196—213 КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну Глебку Васілю Якубаву, жых. в. Каменка і с.-с., Узьдзянскага раёну.

Барысаўскі ЗАГС паведамляе, што ад гр-кі Ступіна Евы паступіла заява аб зьмене імя Ева на імя «Галіна».

Асоб, якія маюць пратэсты супроць зьмены імя, просьба паведаміць аб гэтым Барысаўскі ЗАГС, паказаўшы свае імя, імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 29 чэрвеня г. г. па 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне намесьніку дырэктара БША А. Ерэнбургу Г. З. за тое, што дзякуючы яго нядбайнасьці былі загатоўлены і пасланы ў раёны палітo для дзяцей дашкольнага ўзросту замест школьнага.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 29-VI 31 г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дырэктару ф-кі імя 8-га сакавіка Лісаноўскаму Шлёме Абрамаву за тое, што дзякуючы яго нядбайнасьці былі загатоўлены і пасланы ў раёны палітo для дзяцей дашкольнага ўзросту замест школьнага.

Яўр. нац. суд г. Менску, на падставе прысуду ад 30 мая г. г. па 22-106 арт. КК., абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Этусу І. І. фурману Менбуду за тое, што ён самавольна браў авёс для свайго каня і калі служачы Саюзхлебу зрабіў яму заўвагу, Этус кінуўся да апошняга біцца.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 25-VI 31 г. па арт. 131 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне сьлесару Дзяржшвэймашыны Іцканічу Саламону Барысавічу за тое, што ён самавольна выбрасіў ложак гр-кі Бэрнштэйн з іх агульнай кватэры.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 12-V 31 г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне нам. загадчыка матар'яльна-гаспадарчай часткі заводу «Энэргія» Плот кіну І. Л. за тое, што ён адпусьціў пры ватным возьнікам спэцопратку і шыны нае жалеза.

Яўр. Нарсуд г. Менску, на падставе прысуду ад 29-VI 31 г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку складу ф-кі імя 8-га сакавіка Кабакову Давіду Аронаву за тое, што, пасылаючы на раёны палітo малых разьмераў, ён не паказваў адміністрацыі на нягоднасьць гэткіх разьмераў для дзяцей школьнага ўзросту.

Нарсуд Юравіцкага раёну, на падставе прысуду ад 5 мая г. г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Сасаюк Анісьці Макаравай за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд 2 вуч. г. Менску, на падставе прысуду ад 4-га верасьня г. г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне дырэктару саўгасу Вішнёўка Хількевічу Якаву Якаўлевічу за нездачу своячасова скур на загатоўчыя пункты, чым яўна ігнараваў пастановы ўраду.

Нарсуд Вузьдзенскага раёну, на падставе прысуду ад 29-VIII 1931 г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр-ну м. Узды Піцько Ільлі Сымонаву.

Гамельскі ЗАГС паведамляе, што ад гр-на Халяво Хаіма Абрамава нарадж. 1890 г. паступіла заява аб зьмене прозьвішча Халяво на прозьвішча «Гольдштэйн».

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць Гомельскі ЗАГС, паказаўшы свае імя і імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Гомельскі ЗАГС паведамляе, што ад гр-на г. Гомля Глянца Зельмана Пэйлавіча нарадж. 1907 г. паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Глянц» на прозьвішча «Дуброўскі».

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча, просьба паведаміць Гомельскі ЗАГС, паказаўшы свае імя і імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Гомельскі ЗАГС паведамляе, што ад гр-на г. Гомля Жарабкова Кузьмы Уладзімірава, нарадж. 1910 г. паступіла заява аб зьмене прозьвішча «Жарабкоў» на прозьвішча «Жэмчугаў» і імя «Кузьма» на імя «Юры».

Асоб, якія маюць пратэст супроць зьмены прозьвішча і імя, просьба паведаміць Гомельскі ЗАГС, паказаўшы свае імя і імя па бацьку, прозьвішча і месца жых.

Нарсуд Дрысенскага раёну прыгаварам сваім ад 15 верасьня 1931 г. выносіць грамадзкае ганьбаваньне старшыні Дрысенскага Райкапленсаюзу Каськевічу Адаму Іванавічу і загадчыку Дрысенскай прафшколы Іофе Аляксандру Наумавічу за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Нарсуд Асіпавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 30 чэрвеня г. г. па арт. 121 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. калгасу «Пабядзіцель» Дзергачоўскага сельсавету Герману Мікалаю Іванавічу, за тое, што будучы сакратаром сельсавету ў 1930 г. нядбайна і нясумленна адносіўся да выпіскі цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам, чым зрываў пасьпяховае выкананьне ўсіх відаў загатовак па Дзергачоўскім сельсавеце.


Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—68, сакратара—4-78, сэктараў—6-15. Выдавецтва—2-44. Выпускаючага 12-65 (два ванкі)

Падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ